Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

30 КРАСАВІКА—1 мая 1933 г.

№ 95 (4639)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў,

Няхай жыве першае мая— баявы агляд рэвалюцыйных сіл міжнароднага пралетарыяту!

ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ! ІДЗЕЦЕ ПАД СЬЦЯГІ ЛЕНІНСКАГА КАМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНА.

НАПЕРАД—ДА НОВЫХ БАЕЎ І ПЕРАМОГ!

ПЕРШАЯ МАЁЎКА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

Працоўныя масы Савецкага саюзу і пралетары капіталістычных краін сустракаюць у гэтым годзе сваё баявое сьвята інтэрнацыянальнай пралетарскай салідарнасьці ў іншых умовах, чым калі-б там ні было раней. У Савецкім саюзе, у краіне пралетарскай дыктатуры 1 мая 1933 году праходзіць пад знакам новых перамог сацыялізму, першых перамог першага году другой пяцігодкі. Ва ўсім капіталістычным сьвеце 1 мая праходзіць пад знакам далейшага пашырэньня і паглыбленьня крызісу ўсёй капіталістычнай сыстэмы.

Ня раз за гэтыя чатыры гады найбольшага сусьветнага эканамічнага крызісу буржуазныя эканамісты і палітычныя дзялкі прадракалі набліжэньне канца працэсу развалу сусьветнай гаспадаркі. Гэтыя прадраканьні былі асабліва настойлівымі ў канцы мінулага і пачатку бягучага году. Гэтыя «прароцтвы» аказаліся пустым самаашуканствам і нікчэмнай балбатнёй. Крызіс капіталістычнай гаспадаркі ня толькі не зьмяншаецца, а яшчэ больш пашыраецца і паглыбляецца.

Якраз пачатак гэтага году адзначыўся новай фінансавай катастрофай у Амэрыцы, у гэтай буйнейшай і багацейшай краіне капіталізму, якая сканцэнтравала ў сваіх руках больш паловы ўсяго сусьветнага запасу золата. Увесь вытворчы і крэдытны апарат Злучаных Штатаў, якія адлюстроўваюць і акрасьліваюць лёсы ўсіх капіталістычных краін, знаходзіцца ў стане поўнага паралюшу. Уладар сусьветных біржаў, буйнейшая падпора сусьветнага гандлю — амэрыканскі даляр пацярпеў крах.

Урад Злучаных Штатаў вымушан ад мовіцца ад залатога стандарту і перайсьці па шлях інфляцыі. Гэта ня можа ня весьці да далейшага расстройства сусьветнага гандлю і яшчэ большага абвастрэньня крызісу ва ўсіх капіталістычных краінах.

На выходзе трэцяга году эканамічнага крызісу, у верасьні мінулага году XII пленум ВККІ прызнаў, што пасьлядоўны канец капіталістычнай стабілізацыі і што сьвет уступіў у паласу крутых наваротаў і катастрафічных абрухаў, у паласу рэвалюцый і войнаў. Рэчаіснасьць поўнасьцю пацьвердзіла наш камуністычны аналіз.

Бядоты пралетарскіх мас за межамі СССР узмацніліся. За апошнія тры гады з вытворчасьці выкінуты на вулі[illegible] мільёнаў рабочых і ра[illegible]. У Ан[illegible] 2 млн. беспрацоўных; армія беспрацоўных у [illegible]чаных Штатах дасягае 16 млн.; ва Францыі колькасьць поўнасьцю пазбаўленых работы складае 2.300 тысяч чал., а часткова беспрацоўных — 5.600 тыс. чал., што складае значна больш паловы агульнага ліку рабочых; у Германіі лік беспрацоўных ужо перавысіў 7 млн. чалавек; у Японіі — 3 млн. беспрацоўных; у Польшчы беспрацоўем ужо ахоплена 60 проц. усіх рабочых.

Пямногім лепшае становішча і яшчэ занятых у вытворчасьці рабочых. Ідзе бязупыннае наступленьне агапізуючага капіталу на жыцьцёвы ўзровень рабочай класы. Стараючыся выйсьці з крызісу за кошт рабочых, капіталісты зьніжаюць заработную плату і павялічваюць рабочы дзень.

Ня лепшае становішча і шырокіх сялянскіх мас, якія руйнуюцца аграрным крызісам. Асабліва вялікія бядоты працоўнага сялянства ў суседняй з намі Польшчы. Зьбяднеьне тут, асабліва ў Заходняй Беларусі, дасягнула такой ступені, што масы сялянства пазбаўлены магчымасьці купіць нават такія прадметы шырокага ўжытку, як газа і запалкі.

Імкнучыся пераваліць увесь цяжар крызісу на плечы рабочай класы, буржуазія адначасова вядзе прасны палітычны націск на рабочыя масы, каб зламаць сілу іх рэвалюцыйнага супраціўленьня. Старыя мэтады ашуканьня мас шляхам парляментарызму і «дэмакратыі» ўжо ня дзейнічаюць. Яны ўступаюць месца простаму гвалту, лютаму фашысцкаму тэрору. У Германіі, якая найбольш блізка падыйшла да рэвалюцыйнага крызісу, запаўзлівая фашысцкая дыктатура ў форме ўраду Папэна і Шлейхэра ўжо ня здольна стрымаць нарастаньне рэвалюцыйнай буры і замяняецца адкрытай фашысцкай дыктатурай Гітлера, якая апіраецца на масавую партыю нацыянал-сацыялістаў. Германія стала арэнай найбольш панурай сярэдзініковай рэакцыі, крывавага зацісканьня рабочай класы аб'яднанымі сіламі мананалістычнага капіталу, прускага юнкерства, кайзэраўскай вазнічыны і шалеючых мяшчан.

Прыклад Германіі — павучальны ўрок ня толькі для германскага, але і для ўсяго сусьветнага пралетарыяту. Фашызм ня мог-бы перамагчы ў Германіі, узмацняць свае пазыцыі ў Аўстрыі і ўадымаць галаву ў іншых краінах, калі-б сацыял-дэмакратыя ня выдала з галавой пралетарыят буржуазіі. Сёнешняе становішча ў Германіі — вянец здрадніцкай ролі II Інтэрнацыяналу. Гэта сацыял-дэмакратыя падрыхтавала шлях Гітлеру. Гітлер — просты насьлядоўца Эбэрта і Носке, якія выратавалі германскую буржуазію ад пралетарскай рэвалюцыі ў 1918 г., а потым сыстэматычна абязбройвалі пралетарыят, люта задушаючы і расстрэльваючы яго рэвалюцыйны авангард. Разьюшанае прасьледваньне камуністычнай партыі, зрыў забастовак, здрадніцкія ўдары ў сьпіну пралетарыяту ў важнейшыя моманты клясавай барацьбы, здрадніцтва інтарэсам ня толькі пралетарыяту, але і зруйнаванага сялянства і гарадзкога дробнага люду, сыстэматычныя агідныя паклёпы на пралетарскую рэвалюцыю і СССР — увесь гэты непераруўны ланцуг здрадніцтва сацыял-дэмакратыі расчысьціў шлях крывавай фашысцкай дыктатуры Гітлера.

Германская сацыял-дэмакратыя, праводзячы палітыку «меншага зла», зараз дакацілася да простага апраўданьня фашысцкай дыктатуры і з поўнай гатоўнасьцю ўзяла на сябе даручэньне Гітлера і Герынга абяляць фашысцкі рэжым за граніцай, абвяргаючы факты жудаснага белага тэрору. Каб заслужыць пахвалу сваіх фашысцкіх гаспадароў і захаваць хоць якія-небудзь цёплыя месцы ў фашысцкім дзяржаўным апараце, правадыры сацыял-дэмакратыі пайшлі на фактычны разрыў са сваім «інтэрнацыяналам».

Поўны крах германскай сацыял-дэмакратыі вымушан прызнаць нават орган аўстра-марксыстаў «Арбэйтэр Цэйтунг», які ў нумары ад 23 красавіка піша:

«Страта прэстыжу сацыял-дэмакратыі настолькі вялікая, што для мільёнаў партыя проста перастала існаваць... Тое, што сацыял-дэмакратыя не прыняла бою, калі гэтага хацеў праціўнік, гэта ёй не дапаможа-б. Але тое, што яна пасуну на пакідала бою, што яна ні адной са сваіх пазыцый сапраўды не абараняла, а пязьмення адступала, тое, што яна прапусьціла апошні шанс 20 ліпеня мінулага году, — у гэтым тоіцца прычына. Чаму сёньня нацыянал-сацыялізм панае над скаванай рабочай клясай Германіі».

Такое прызнаньне не перашкаджае самім аўстра-марксыстам у сябе ў Аўстрыі праводзіць якраз такую-ж здрадніцкую палітыку. Германская сацыял-дэмакратыя — люстра ўсяго II Інтэрнацыяналу. Як-бы некаторыя правадыры II Інтэрнацыяналу ні прабавалі сарамліва [illegible] ад сваіх германскіх таварышоў, [illegible] у сваіх краінах адыгрываюць тую-ж самую здрадніцкую ролю.

Кампартыя Германіі ў выніку здрадніцтва сацыял-фашыстаў, за якімі яшчэ ішла большасьць рабочай класы, не магла прадухіліць перамогі фашысцкай дыктатуры. Але кампартыя, загнаная ў падпольле, на якую звалілася ўся арасьць фашысцкага тэрору, засталася на сваім баявым пасту. Германскі пралетарыят часова адступіў, ня прыняўшы бою ў невыгодных умовах, але ён не разьбіт. Шматлікія факты паказваюць рост баявога абурэньня агалцелым тэрорам фашысцкіх банд. Кампартыя, перабудаваўшы свае рады, перайшоўшы на нелегальную работу, кіруе па-ранейшаму рэвалюцыйнай барацьбой пралетарскіх мас. Як адзіны змагар супроць фашызму, сваёй энэргіяй, мужнасьцю і адвагай, яна становіцца цэнтрам мабілізацыі мас для зьвяржэньня фашысцкай дыктатуры.

Фашысцкая дыктатура ў Германіі ня можа вырашыць ні адной сур'ёзнай эканамічнай і зьнешня - палітычнай праблемы. Яна ня можа даць беспрацоўным работы і хлеба, яна ня ў сілах вызваліць краіну, з цяжкой пячуванага крызісу. Буйны капітал, ад імя якога кіруе зараз Германіяй Гітлер, ня можа існаваць не вядучы араснага наступленьня на жыцьцёвы ўзровень рабочых і працоўных мас. Фашызм у Германіі ўпадзе ахвярай сваёй уласнай «антыкапіталістычнай» дэмагогіі. Хутка адкрыюцца вочы ашуканых мас дробнай буржуазіі, якіх нельга карміць аднымі пышнымі парадамі і факельнымі паходамі. Даведзеныя да крайнята кіпеньня шавіністычныя палкасьці пагасьцуць перад фактамі рэчаіснасьці. Сусьветная буржуазія, хоць і анлёдуе германскаму фашызму, бачачы ў ім аплот супроць бальшавізму, тым ня менш з прычыны жорсткай барацьбы за рынкі, за захаваньне і пашырэньне ўласных пазыцый, у вельмі малой меры схільна задаволіць рэваншысцкія тэндэнцыі германскага імпэрыялізму. Перагледу граніц, роўнасьці ва ўзбраеньнях германскі фашызм можа дабіцца толькі шляхам вайны. Каб дабіцца якіх-небудзь уступак, ён гатоў уключыць Германію ў антыфашысцкі фронт.

Прыход да ўлады Гітлера выклікаў вялізарнае абвастрэньне ўсіх міжнародных супярэчнасьцяй, якія і так ужо дасягнулі крайняй вострасьці. На Далёкім Усходзе другі год цягнецца вайна. Японскі імпэрыялізм, запяўшы і падначаліўшы сабе Манчжурыю, захватвае правінцыю Жэхэ, урываецца ў Паўночны Кітай. Адначасова японскі імпэрыялізм правакуе СССР сваімі захватніцкімі дзеяньнямі на КУЧ. Насьпявае вайна паміж Японіяй і Амэрыкай. У капіталістычнай Эўропе таксама завязваюцца вузлы новых войнаў.

Пытаньне аб вайне, аб новым перадзеле сьвету, аб новым перазьмеркаваньні рынкаў і калёній настаўлена ў парадак дня. Супярэчнасьці абвастраюцца па ўсіх лініях: Англія — Францыя, Францыя — Італія, Францыя — Германія, Германія — Польшча і г. д.

Узмацніліся спробы згуртаваць антысавецкі фронт. Аб гэтым гаворыць антысавецкі зьмест пляну Мусаліні-Макданальда, шалёнствы ангельскіх цьвёрдалобых у сувязі з працэсам шкоднікаў і шпіёнаў, правакацыі на КУЧ, антысавецкая палітыка правадыроў германскага фашызму.

Усё гэта падае 1 мая бягучага году асабліва баявы характар. Пад сьцягамі адзінага пралетарскага фронту, пад сьцягамі Камінтэрну, супроць наступленьня капіталу, супроць фашызму, супроць вайны і ў абарону СССР, супроць дыктатуры буржуазіі, за дыктатуру пралетарыяту будуць сёньня дэманстраваць масы пралетараў ва ўсіх краінах.

Прыклад СССР паказвае шлях усяму сусьветнаму пралетарыяту. 1 мая бягучага году — першая маёўка другой пяцігодкі. СССР у рэзультаце першай пяцігодкі ператварыўся з адсталай і аграрнай краіны ў краіну індустрыяльную, з [illegible] прамысловасьцю. Створана тэхнічная [illegible] ўсёй народнай [illegible]даркі. Краіна дробнай сялянскай [illegible]даркі стала краінай буйнога [illegible]ялістычнага земляробства. Створана таксама магутная аснова абароны СССР супроць узброенага нападу імпэрыялістаў. Намі ўжо атрыманы буйнейшыя перамогі ў асваеньні новай тэхнікі. Прыкладам гэтага зьяўляецца наша аўтатрактарная прамысловасьць.

Буйнейшыя посьпехі дасягнуты намі ў справе арганізацыйнага ўмацаваньня калгасаў па аснове ўказаньняў тав. Сталіна. Мы на шляху да шпаркага ператварэньня калгасаў ва ўзорныя, высока-таварныя і высокадаходныя гаспадаркі, якія забясьпечваюць ажыцьцяўленьне задачы ператварэньня калгасьнікаў, учарайшых беднякоў і сераднякоў, у заможных.

Падцягнуць вугольную і мэталюргічную прамысловасьць, дабіцца поўнага асваеньня новай тэхнікі, новых прадпрыемстваў, [illegible] сабекошт, палепшыць якасьць прадукцыі, на бальшавіцку правесьці веснавую сяўбу, дабіўшыся рэзкага павышэньня ўраджайнасьці — вось задачы, якія стаяць цяпер перад намі.

Савецкая Беларусь, стаўшая на аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі адной з перадавых рэспублік Савецкага саюзу, у гэтым годзе робіць новы буйны крок наперад у справе далейшага разьвіцьця і ўмацаваньня сваёй маладой прамысловасьці і ўмацаваньня новага калгаснага ладу.

Мы сьвяткуем першага мая пад знакам новых сацыялістычных перамог. У нас няма беспрацоўя, у нас расьце жыцьцёвы ўзровень рабочай класы і ўпас ёсьць усе магчымасьці няўхільна ўзьнімаць яго ўсё вышэй.

На Далёкім Усходзе ўсё шырэй разгараецца полымя грабежніцкай вайны Японіі супроць Кітаю. Усе супярэчнасьці капіталістычнай сыстэмы дасягнулі крайняга напружаньня. На чарзе імпэрыялістычная бойня за новы перадзел сьвету. У Эўропе крызіс вэрсальскай сыстэмы пагражае кожную гадзіну ўвергнуць працоўных у новыя крывавыя сутыкненьні. Ліхаманкава заварушыліся ўсе падпальшчыкі вайны супроць СССР, краіны пралетарскай дыктатуры і сацыялізму. Пакт чатырох дзяржаў, які майструецца двума былымі сацыялістамі—Макданальдам і Мусаліні, ёсьць пакт умацаваньня фашысцкай рэакцыі і антысавецкага блёку супроць СССР.

Набліжаюцца рашаючыя схваткі паміж сьветам эксплёатуемых і сьветам эксплёататараў. Усюды расьце хваля абурэньня рабочых і сялян супроць капіталізму, буржуазнай дыктатуры і фашысцкага тэрору. Адбываецца глыбокае рэвалюцыйнае хваляваньне працоўных, няўхільна нарастае рэвалюцыйны ўздым. Глеба пад капіталізмам хістаецца. У бурных стачачных баёх, у геройчнай барацьбе пралетарыяту супроць фашызму, у паўстаньнях ва Фнёце, у перамогах Чырвонай арміі ў Кітаі капіталістычная рэакцыя адчувае падземныя штуршні рэвалюцыйнага выбуху, які набліжаецца. Яна шапенствуе таму, што перамогі сацыялізму ў СССР рэвалюцыянізуюць усё больш рабочых і прыгнечаных усяго капіталістычнага сьвету.

Рабочыя капіталістычных краін, пралетары Германіі! Мы, камуністы, на працягу году год гаварылі вам, што II Інтэрнацыянал вядзе вас да фашызму і імпэрыялістычных войнаў. Чаму ў Германіі буржуазіі ўдалося ўстанавіць крывавую фашысцкую дыктатуру? Гэта ёй удалося таму, што сацыял-дэмакратыя перайшла на яе бок, што буржуазія апіраласа і апіраецца на сацыял-дэмакратыю, якая дасталася германскі пралетарыят.

У 1914 годзе сацыял-дэмакратыя растаптала ў крыві міжнародную салідарнасьць рабочай клясы. На працягу амаль двух дзесяткаў гадоў міжнародная сацыял-дэмакратыя падтрымлівае імпэрыялістычны разбой сваіх буржуазных урадаў, нястомна рыхтуючы новыя імпэрыялістычныя войны. Пад сьцягам «абароны бацькаўшчыны» і «нацыянальнай абароны» яна ўмацоўвае ваенны апарат буржуазіі, разбройваючы рабочых перад тварам клясавага ворага. Яна ўжывала сыстэматычна рэакцыйны гвалт супроць пралетарыяту, заклікаючы ў той-жа час рабочых адмовіцца ад масавага рэвалюцыйнага гвалту супроць буржуазіі. Хіба II Інтэрнацыянал сваёй палітыкай адзінага рэакцыйнага фронту з буржуазіяй ня зрываў адзіны рэвалюцыйны фронт барацьбы пралетарыяту? Хіба ён не аслабляў расколам рабочага руху, яго сілу супраціўленьня наступленьню капіталу і фашызму? Хіба II Інтэрнацыянал, разгрэмляючы авангард рабочай клясы—камуністычных рабочых, не аслабляў тым самым рабочую клясу ў цэлым? Гэта германская сацыял-дэмакратыя, мацнейшая сэкцыя II Інтэрнацыяналу, здаючы буржуазіі крок за крокам, заваяваныя рабочымі пазыцыі, расчышчала дарогу фашызму і прывяла яго да ўлады ў Германіі. Гэта II Інтэрнацыянал сваім паклёпам супроць пралетарскай дыктатуры, сацыялізму і Чырвонай арміі—аплоту СССР—падрываў давяр'е актыўнасьці рабочай клясы ў яе барацьбе за дыктатуру пралетарыяту. Гэта II Інтэрнацыянал прымаў непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР, стараючыся абязброіць пралетарыят і на міжнародным арэне.

Рабочыя і работніцы!

Ці не гаварылі вам камуністы, што толькі парваўшы з II Інтэрнацыяналам і з яго палітыкай клясавага супрацоўніцтва, вы адновіце рэвалюцыйнае адзінства рабочай клясы на аснове між народнай салідарнасьці працоўных? У гэтым, і перш за ўсё ў гэтым, ляжыць гарантыя вашай пасьпяховай барацьбы супроць наступленьня капіталу, фашызму і імпэрыялістычных войнаў. За гэта рэвалюцыйнае адзінства рабочай клясы, за гэты адзіны рэвалюцыйны фронт змагаліся заўсёды камуністы. Яны былі ўсюды ў першых радох пралетарскай барацьбы супроць капіталу. Яны прымалі на сябе найбольш цяжкія ўдары фашысцкага тэрору. Ня было такога выпадку, калі сацыял-дэмакратычныя рабочыя готовы былі змагацца і камуністы не стаялі-б з імі бок у бок у гэтай барацьбе.

Але ці ня мелі рацыі камуністы, калі яны папярэджвалі вас, што II Інтэрнацыянал і яго партыя ня хочуць адзінага фронту клясавай барацьбы пралетарыяту? Міжнародная сацыял-дэмакратыя зрывала і зрывае і будзе зрываць адзіны фронт рабочых, каб выратаваць капіталізм.

У Германіі галоўнейшая партыя II Інтэрнацыяналу перайшла на бок фашызму. Вуснамі свайго правадыра Вэльса яна цынічна прызнае, што прыняла Гітлера да ўлады.

Яна выпрошвае ў фашыстаў права на ўключэньне яе ў сыстэму фашысцкай дыктатуры, выказваючы гэтым сваю гатоўнасьць прымаць удзел са ўсіх крывавых злачынствах фашызму супроць рабочай клясы. Яна перадае профсаюзы фашыстам. Яна абараняе тэрарыстычную дыктатуру фашыстаў, выступаючы ў ролі простай фашысцкай агентуры заграніцай. Яна ў рэйхстагу салідарызуецца цалкам з палітыкай вайны германскага фашызму. Яна, паводле распараджэньня Гітлера, выходзіць з II Інтэрнацыяналу, адкрыта становячыся нацыяналістычнай «нямецкай» партыяй.

Шлях германскай сацыял-дэмакратыі—ёсьць шлях усяго II Інтэрнацыяналу. Сацыял-дэмакратычная палітыка «меншага зла», прывёўшая Гітлера да ўлады, гэта палітыка рэакцыйнага адзінства фронту ўсяго II Інтэрнацыяналу з буржуазіяй супроць рэвалюцыйных рабочых. Няўжо выдатнейшыя лідэры II Інтэрнацыяналу—Макданальд, Гокас, Сноўдэн, Бонкур — не перайшлі адкрыта ў лягер буржуазіі? Аўстрыйская сацыял-дэмакратыя пад сьцягам абароны дэмакратыі ўжо шчыльна падвяла сьледам за германскай сацыял-дэмакратыяй рабочую клясу пад удары фашызму. Яе ранейшыя хвальлівыя заявы, што яна адкажа гвалтам тады, калі буржуазія пяройдзе да гвалту, былі тэйжа тактыкай абязброеньня пралетарыяту, што і тактыка меншага зла. Французкія сацыялісты, як Вэльс—Лейпарт, стаяць на глебе адзінага фронту з буржуазіяй і шалёна змагаюцца супроць адзінага фронту рабочай клясы. Справа ня ў тым, з якой фракцыяй буржуазіі —«левай», умеркаванай або правай— сацыялісты ідуць у блёку супроць пралетарыяту. Справа ў тым, што гэта толькі розныя этапы фашызацыі сацыял-дэмакратыі.

Двуліцыя фразы французкіх сацыялістаў і ангельскіх лейбарыстаў супроць германскага фашызму,—толькі прыкрыцьцё свайго «нацыянальнага» імпэрыялізму, які падрыхтоўвае новую вайну.

Запамятай моцна, пралетар, што міжнародная сацыял-дэмакратыя пічыць за лепшае адзіны фронт з фашызмам для абароны і выратаваньня капіталізму, чым адзіны фронт рабочай клясы для зьвяржэньня капіталізму шляхам пралетарскай рэвалюцыі.

Запамятай моцна, пралетар, што II Інтэрнацыянал у момант найвялікшай небясьпекі вас[illegible] фашызму адхіліў прапанову Камуністычнага Інтэрнацыяналу ад 5 сакавіка 1933 г. аб адзіным фронце барацьбы супроць фашызму і наступленьня капіталу.

Пралетары ўсяго сьвету!

У дзень 1 мая, у дзень міжнароднай пралетарскай салідарнасьці, перад тварам новай страшэннай здрады германскай сацыял-дэмакратыі і II Інтэрнацыяналу, Камуністычны Інтэрнацыянал, сапраўдная арганізацыя пралетарскага адзінства і міжнароднай пралетарскай салідарнасьці, кліча вас устанавіць рэвалюцыйнае адзінства рабочай клясы вашымі ўласнымі рукамі. Шлях да такога адзінства ідзе праз сумесную барацьбу ўсіх рабочых, незалежна ад іх партыйнай прыналежнасьці, на аснове адзінага рэвалюцыйнага фронту, супроць наступленьня капіталу, фашызму і імпэрыялістычнай вайны.

Камуністычны Інтэрнацыянал заклікае вас, пралетары, ажыцьцяўляць адзіны баявы фронт у ПЕРШАМАЙСКІХ МАСАВЫХ ЗАБАСТОЎКАХ, ДЭМАНСТРАЦЫЯХ, МІТЫНГАХ і іншых формах пратэсту супроць ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ Ў ГЕРМАНІІ, СУПРОЦЬ РАЗБОЮ ЯПОНСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ, СУПРОЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ НОВАЙ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ І ПЕРШ ЗА ЎСЁ ВАЙНЫ З САВЕЦКІМ САЮЗАМ, АРГАНІЗУЕМАЙ АНГЕЛЬСКІМІ ЦЬВЁРДАЛОБЫМІ І ІХ ПАСЫЛЬНЫМ — НАЦЫЯНАЛ - ЛЕЙБАРЫСТАМІ НА ЧАЛЕ З МАКДАНАЛЬДАМ.

Кідайце работу, пралетары, у дзень 1-га мая выходзьце на вуліцу, дэманструйце супроць наступленьня капіталу, фашызму і вайны.

Рабочыя і работніцы!

Адзіны фронт зьнізу, а не верхавінныя перагаворы з Вэльсам і Рэнадэлем —вось што нам трэба цяпер. Для правядыроў II Інтэрнацыяналу верхавінныя перагаворы—толькі сродак адцягнуць, перашкодзіць і сарваць адзіны фронт рабочай клясы. Толькі ініцыятыва самых рабочых мас, іх дзейсны ўдзел, іх кантроль на аснове сапраўднай рабочай дэмакратыі, толькі адзіны фронт зьнізу забасьпечыць посьпех выкананьня гэтай цэнтральнай задачы сусьветнага рабочага руху ў сучасны момант. Толькі барацьба самих мас пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі пакладзе канец выкарыстаньню сацыял-дэмакратыяй рабочых для ўмацаваньня адзінага рэакцыйнага фронту капіталу. Толькі масавы фронт пралетарскай барацьбы выйдзе за межы асобных краін, злучыцца з геройчным пралетарыятам СССР, з яго вялікай справай сацыялістычнага будаўніцтва, з саветамі Кітаю, стане фронтам барацьбы ўсёй міжнароднай рабочай клясы. Толькі такім шляхам будзе ажыцьцёўлена сапраўдная міжнародная салідарнасьць пралетарыяту. Няма і ня будзе такой сілы ў сьвеце, якая-б зламіла гэты міжнародны фронт.

Сваім клясавым рэвалюцыйным фронтам пралетарыят павялічыць у нябывалай ступені сваю баяздольнасьць. Ён узмоцніць свой уплыў і сваю вядучую ролю на сялянскія масы, на ўсіх эксплёатуемых, на ўсіх працоўных мэтраполіі і калёній.

Шырокімі масавымі забастоўкамі СУПРОЦЬ ЗЬНІЖЭНЬНЯ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ, ЗА ЯЕ ПАВЫШЭНЬНЕ, барацьбой ЗА 40-ГАДЗІННЫ ТЫДЗЕНЬ З ЗАХАВАНЬНЕМ ПОЎНАЙ ЗАРПЛАТЫ, ЗА НЕАДКЛАДНУЮ ДАПАМОГУ БЕСПРАЦОЎНЫМ, ЗА САЦЫЯЛЬНАЕ СТРАХАВАНЬНЕ ЗА КОШТ КАПІТАЛІСТАЎ — пралетарыят адновіць сваё рэвалюцыйнае адзінства, як клясы.

Сваімі палітычнымі выступленьнямі СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ, У АБАРОНУ СВАЙГО ДРУКУ, СВАІХ ПАЛІТЫЧНЫХ ПРАВОЎ, СВАІХ КЛЯСАВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ — пралетарыят умацуе і пашырыць гэтае адзінства на палітычнай арэне.

Сваёй самаахвярнай абароной патрабаваньняў сялян, якія руйнуюцца, барацьбой за НЕАДКЛАДНУЮ ДАПАМОГУ ІМ ЗА КОШТ АГРАРЫЯЎ, [illegible]бой за АНУЛЯВАНЬНЕ СЯЛ[illegible] ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦІ І ЗА ВЫЗВЕ[illegible]НЕ АД ПАДАТКАЎ, аб'яднань[illegible]тарыят пашырыць свой рэвал[illegible] адзіны фронт уключэньнем у я[illegible]ных мас сялянства.

Гэтым, і толькі гэтым шл[illegible] падыйдзе да барацьбы за дыктатуру.

«Камуністы, — пісаў 85 год таму зад Маркс у «Камуністычным манифэсце», — пічаць лішнім утаіваць свае погляды і намеры. Яны адкрыта заяўляюць, што іх мэты могуць быць дасягнуты толькі шляхам гвалтоўнага зьвяржэньня ўсяго існуючага грамадзкага ладу».

І зараз Камуністычны Інтэрнацыянал адкрыта заяўляе мільёнам рабочых усяго сьвету, што ня можа быць сапраўднага адзінства рабочай клясы без барацьбы за гвалтоўнае зьвяржэньне ўсяго існуючага капіталістычнага ладу, за ўстанаўленьне пралетарскай дыктатуры. Банкрутства германскай сацыял-дэмакратыі — гэта крушэньне легенды ўсяго II Інтэрнацыяналу аб дэмакратыі, як шляху да сацыялізму. Ведайце, рабочыя, што няма іншага шляху да зьдзяйсьненьня ад ярма капіталу, як ПРАЛЕТАРСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ, няма іншага шляху да сацыялізму, як ПРАЛЕТАРСКАЯ ДЫКТАТУРА. Ведайце, рабочыя, што фашысты ў Германіі прышлі да ўлады таму, што германская сацыял-дэмакратыя патапіла ў крыві пралетарскую рэвалюцыю 1918-1919 г. г., таму, што яна, сарваўшы барацьбу за пралетарскую дыктатуру, бязупынна ўмацоўвала дыктатуру буржуазіі. Ведайце, рабочыя, што так будзе ўсюды, пакуль вы ня выганіце са свайго асяроддзя сацыял-дэмакратычных агент[illegible] буржуазіі.

Толькі пралетар[illegible] шлях пра[illegible] рэвал[illegible]тарскай дыктатуры, на ва[illegible] крызісаў, ні [illegible], заработнай платы, ні зруйнав[illegible]лян, ні прыгнечанасьці [illegible]гой, ні міжнароднай кабалы і [illegible]насьці. Краіна Савецкага саюзу — краіна сацыялістычных фабрык, краіна калгасных палёў, краіна перамогаў пяцігодкі, стаіць несакрушальнай сьцяной супроць сусьветнага фашызму, мабілізуючы посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва рабочую клясу ўсяго сьвету супроць капіталізму. Бязьлітасна [illegible] пакідаючы капіталістычныя элементы, ліквідуючы кулацтва, як клясу, пралетарыят СССР [illegible] савага грамадзтва. Працоў[illegible]га саюзу кожны дзень [illegible] ступным шматмільённым масам паказваюць пераваг сацыялістычнай сыстэмы перад сыстэмай капіталізму, які разлагаецца.

Выбірайце-ж рабочыя!

Або капіталістычнае рабства, або пралетарская рэвалюцыя.

Або фашызм, або дыктатура пралетарыяту.

Або капіталізм, або сацы[illegible]

Або міжнародная пра[illegible] дарнасьць, або імпэрыялі[illegible]на.

Або рабства калёній і раб[illegible] клясы, або незалежнасьць [illegible]ных народаў і вызвален[illegible]яту.

І мільёны пралетараў [illegible] свой выбар. Заўтра яго зробяць працоўныя ўсяго сьвету.

Далоў капіталізм!

Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя!

Далоў фашысцкую дыктатуру!

Няхай жыве дыктатура пралетару!

Няхай жыве камунізм!

ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ [illegible]НІСТ[illegible] ІНТЭРН[illegible]НА[illegible]

АДОЗВА ВЫКАНКОМУ КАМІНТЭРНА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН!

Няхай жыве 1-га мая, міжнародны дзень барацьбы рабочай клясы супроць капіталізму.

Сёнешні дзень, дзень першага мая — ёсьць дзень рэвалюцыйнага агляду сіл рабочай клясы. Рабочыя ўсяго сьвету сустракаюць гэты дзень у абстаноўцы самых жорсткіх клясавых сутычак. Чатыры гады цягнецца сусьветны эканамічны крызіс. Амаль палова рабочай клясы капіталістычных краін ужо выкінута капіталістамі на вуліцу і падвергнута ўсім жахам беспрацоўя. Заработная плата рабочых неймаверна зьніжана. Вялізарныя масы пралетараў заняты няпоўны рабочы дзень. У разгар сусьветнага крызісу буржуазія ўрэзвае або зьнішчае ўсе віды сацыяльнага страхаваньня. Мільёны рабочых і іх сем'яў галадаюць. Сялянства зруйнавана аграрным крызісам, узрастаючымі падаткамі і ліхвярскай кабалой. Працоўныя капёній, якія ограбляюцца і прыгнечваюцца імпэрыялістычнымі разбойнікамі, асуджаны на масавае галоднае выміраньне. Галеча і зьбяднень не працоўных мас ва ўсім капіталістычным сьвеце дасягнулі нябывалых разьмераў.

Ніколі яшчэ капіталістычны сьвет не ўяўляў сабой такога хаосу як сёньня. А крызісу ня відаць канца. Збанкрутаваны капіталізм можа толькі ўзмацніць ограбленьне працоўных, але ён не дае і ня дасьць работы беспрацоўным, хлеба галодным. Ня маючы сілы знайсьці выхад з крызісу, буржуазія пераходзіць у радзе капіталістычных краін да адкрытай фашысцкай дыктатуры. Яна цягне працоўных у бяздоньне новых імпэрыялістычных войнаў.

Палітычная рэакцыя расьце ва ўсім капіталістычным сьвеце. У Германіі—разгул фашысцкага тэрору: сотні рабочых забіты, тысячы пакалечаны катаваньнямі ў фашысцкіх засьценках і ка зармах, дзесяткі тысяч кінуты ў турмы і канцэнтрацыйныя лягеры, закрыт камуністычны друк, разгромлены памяшканьні рабочых арганізацый, захвачана фашысцкімі бандамі іх маемасьць, набытая на рабочыя працоўныя грошы.

На Далёкім Усходзе ўсё шырэй разгараецца полымя грабежніцкай вайны Японіі супроць Кітаю. Усе супярэчнасьці капіталістычнай сыстэмы дасягнулі крайняга напружаньня. На чарзе імпэрыялістычная бойня за новы перадзел сьвету. У Эўропе крызіс вэрсальскай сыстэмы пагражае кожную гадзіну ўвергнуць працоўных у новыя крывавыя сутыкненьні. Ліхаманкава заварушыліся ўсе падпальшчыкі вайны супроць СССР, краіны пралетарскай дыктатуры і сацыялізму. Пакт чатырох дзяржаў, які майструецца двума былымі сацыялістамі—Макданальдам і Мусаліні, ёсьць пакт умацаваньня фашысцкай рэакцыі і антысавецкага блёку супроць СССР.

Набліжаюцца рашаючыя схваткі паміж сьветам эксплёатуемых і сьветам эксплёататараў. Усюды расьце хваля абурэньня рабочых і сялян супроць капіталізму, буржуазнай дыктатуры і фашысцкага тэрору. Адбываецца глыбокае рэвалюцыйнае хваляваньне працоўных, няўхільна нарастае рэвалюцыйны ўздым. Глеба пад капіталізмам хістаецца. У бурных стачачных баёх, у геройчнай барацьбе пралетарыяту супроць фашызму, у паўстаньнях ва Фнёце, у перамогах Чырвонай арміі ў Кітаі капіталістычная рэакцыя адчувае падземныя штуршні рэвалюцыйнага выбуху, які набліжаецца. Яна шапенствуе таму, што перамогі сацыялізму ў СССР рэвалюцыянізуюць усё больш рабочых і прыгнечаных усяго капіталістычнага сьвету.

Рабочыя капіталістычных краін, пралетары Германіі! Мы, камуністы, на працягу году год гаварылі вам, што II Інтэрнацыянал вядзе вас да фашызму і імпэрыялістычных войнаў. Чаму ў Германіі буржуазіі удалося ўстанавіць крывавую фашысцкую дыктатуру? Гэта ёй удалося таму, што сацыял-дэмакратыя перайшла на яе бок, што буржуазія апіраласа і апіраецца на сацыял-дэмакратыю, якая дасталася германскі пралетарыят.

У 1914 годзе сацыял-дэмакратыя растаптала ў крыві міжнародную салідарнасьць рабочай клясы. На працягу амаль двух дзесяткаў гадоў міжнародная сацыял-дэмакратыя падтрымлівае імпэрыялістычны разбой сваіх буржуазных урадаў, нястомна рыхтуючы новыя імпэрыялістыч

„НАША БЛІЖЭЙШАЯ ЗАДАЧА—ЗРАБІЦЬ УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ ЗАМОЖНЫМІ“ (І. СТАЛІН)

ЗДЗЕЙСНІМ ПЕРШАМАЙСКІЯ ДНІ У ДНІ ПЕРАМОГ НА ПАСЕУНЫМ ФРОНЦЕ

ВЫШЭЙ СЬЦЯГІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА НА ПАЛЁХ, ВЫШЭЙ ТЭМПЫ І ЯКАСЬЦЬ СЯЎБЫ, ЗА МОЦНУЮ ПРАЦОЎНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ Ў КОЖНЫМ КАЛГАСЕ, ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

калгасаў, якія датэрмінова скончылі сяўбу раньніх яравых

РАПАРТУЕМ ЗАСЕЯНЫМІ ГЭКТАРАМІ

ГОМЕЛЬ

КАЛГАСЫ «ШЛЯХ ДА САЦЫЯЛІЗМУ», ІМЯ ЛЕНІНА І «ПАЛЕСКАЯ ПРАЎДА». ПЛЯН СЯЎБЫ АЎСА І РАНЬНІХ ЯРАВЫХ ВЫКАНАН ПОЎНАСЬЦЮ.

САЎГАСЫ ГОМЕЛЬСКАГА МАЛАКАПРАМТРЭСТУ: УВАРАВІЧЫ І СТРЭЛІЧАВА. САЎГАС СТРЭЛІЧАВА ПЕРШЫМ ДА ТЭРМІНУ ЗАСЕЯЎ 250 ГЭКТАРАЎ РАНЬНІХ ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР.

ЕЛЬСК

КАЛГАСЫ «10 ЗЬЕЗД САВЕТАЎ БЕЛАРУСІ», ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», «СЕРП І МОЛАТ».

КАЛГАС «10 ЗЬЕЗД САВЕТАЎ БЕЛАРУСІ» ПАЧАЎ СЯЎБУ ЯРАВЫХ ПЕРШЫМ У НАШАЙ РЭСПУБЛІЦЫ — У ДНІ РАБОТЫ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ. СЯЎБА АЎСА І ІНШЫХ РАНЬНІХ ЯРАВЫХ КУЛЬТУР СКОНЧАНА 10 КРАСАВІКА. ПЛЯН ВЫКАНАН ПОЎНАСЬЦЮ.

НА ПАЛЁХ КАЛГАСУ ЎЗЫШЛІ ЎСХОДЫ. ЯКАСЬЦЬ УСХОДАЎ — ДОБРАЯ.

АСАБЛІВА ЎЗОРНА ПРАЦУЕ БРЫГАДА ТАВ. КАВАЛЕНКІ. БРЫГАДА ВЫКАНАЛА СВАЁ ЗАДАНЬНЕ ПА СЯЎБЕ АЎСА, ПШАНІЦЫ І ЯРАВОГА ЖЫТА 8 КРАСАВІКА.

У КАЛГАСЕ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА [illegible] ВЫСОКІХ ТЭМПАЎ СЯЎБЫ [illegible] ПАЛЯВОДЧАЯ БРЫГАДА [illegible]АРКОЎСКАГА — ДЭЛЕГАТА [illegible] ВСЕСАЮЗНАГА І ВСЕБЕ[illegible]ГА ЗЬЕЗДАЎ КАЛГАСЬНІ[illegible]НІКАЎ. БРЫГАДА ПЕРА[illegible]ВА ПЛЯН СЯЎБЫ РАНЬНІХ [illegible] ДА 10 КРАСАВІКА.

[illegible]ЧЫЦА

[illegible]ДЗЕРЖЭЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ. УСЕ КАЛГАСЫ І ПРАЦОЎНЫЯ АДНААСОБІНІ ГЭТАГА СЕЛЬСАВЕТУ ДА 25 КРАСАВІКА ПОЎНАСЬЦЮ ЗАСЕЯЛІ АВЕС І ІНШЫЯ РАНЬНІЯ ЯРАВЫЯ КУЛЬТУРЫ. ПЛЯН СЯЎБЫ АЎСА ПА СЕЛЬСАВЕЦЕ ПЕРАВЫКАНАН ДА 25 КРАСАВІКА НА 22 ГЭКТАРЫ. РАЗГОРТВАЕЦЦА СЯЎБА ПРАЛАШНЫХ.

КАЛГАСЫ ІНШЫХ СЕЛЬСАВЕТАЎ: ДА 25 КРАСАВІКА ПОЎНАСЬЦЮ ЗАСЕЯЛІ АВЕС НАСТУПНЫЯ С.-Г. АРЦЕЛІ: «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», «ШЛЯХ ЛЕНІНА», «НОВЫ ШЛЯХ», «XII КАСТРЫЧНІК», «ДОБРААХВОТНІК».

ДА 25 КРАСАВІКА ПОЎНАСЬЦЮ ЗАСЕЯЛІ ЎСЕ РАНЬНІЯ КУЛЬТУРЫ НАСТУПНЫЯ С.-Г. АРЦЕЛІ: «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ», «ДНЕПРАБУД», «ЧЫРВОНЫ БАРАЦЬБІТ», «ЛАНДАРБЭЙТ», «РУХАВІК РЭВАЛЮЦЫІ», «ПЕРАМОГА», ІМЯ МОРГУ, ІМЯ БУДЗЕННАГА, [illegible] РЭВАЛЮЦЫІ», «ЗАРА», [illegible] ДНЕПРО», ІМЯ ЛЕНІНА, [illegible]НІВА», «ПІ[illegible]

[illegible]ОЎ

[illegible] «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧ[illegible] СЯЎБА РАНЬНІХ СКОНЧАНА [illegible] КРАСАВІКА. ПЛЯН ПА СЯЎБЕ АЎСА, ЯЧМЕНЮ, ПШАНІЦЫ І БАБОВЫХ КУЛЬТУР ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАН. ЛЕПШЫЯ УДАРНІКІ — ТРАКТАРЫСТ ТАВ. БЫЧКОЎ, ЧЛЕН ПАРТЫІ І КАМСАМОЛЕЦ ГОЛУБ.

МАЗЫР

КАЛГАСЫ «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ» І ІМЯ ВАРАШЫЛАВА (БЯРОЗАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ).

ЛОЕЎ

КАЛГАСЫ «ДНЯПРО» І ІМЯ СТАЛІНА, КРУПСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. КАЛГАС «ДНЯПРО» НЯ ТОЛЬКІ ПОЎНАСЬЦЮ ЗАСЕЯЎ ДА 25 КРАСАВІКА ВАЕС, ЯЧМЕНЬ І ВІКУ, АЛЕ І ВЫКАНАЎ УЖО ЗАДАНЬНЕ ПА СЯЎБЕ ІЛЬНУ.

КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА, СКОНЧЫЎШЫ ДА 25 КРАСАВІКА СЯЎБУ АЎСА, ЯЧМЕНЮ, ВІКІ І БАБОВЫХ КУЛЬТУР, УЖО АМАЛЬ ЗАВЯРШЫЎ СЯЎБУ ІЛЬНУ І БУЛЬБЫ. НА 27 КРАСАВІКА ПЛЯН ПА БУЛЬБЕ БЫЎ ВЫКАНАН У РАЗЬМЕРЫ 60 ПРОЦ.

ЧАЧЭРСК

КАЛГАСЫ «ПЯЦІГОДКА», «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА», «АДЗІНСТВА», «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ». СЯЎБА АЎСА І ІНШЫХ РАНЬНІХ ЯРАВЫХ СКОНЧАНЫ ДА 23 КРАСАВІКА.

КАМАРЫН

КАЛГАСЫ ІМЯ КАРЛА МАРКСА І «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ». КАЛГАС ІМЯ КАРЛА МАРКСА ПОЎНАСЬЦЮ ЗАСЕЯЎ АВЕС ДА 12 КРАСАВІКА, ПЕРАВЫКАНАЎШЫ ПЛЯН НА 0,5 ГА.

СЛУЦАК

КАЛГАСЫ «ЗЬВЯЗДА», «ЧЫРВОНЫ СЬВЕТ», ІМЯ СТАЛІНА, «БАЛЬШАВІЦКАЯ ЗОРКА», ІМЯ РОЗЫ ЛЮКСЭМБУРГ, «ЧЫРВОНЫ БУДАЎНІК», «ПРАЎДА», «ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН», «КАМІНТЭРН», «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ», «ПАМЯЦЬ ІЛЬЛІЧА», «ШЛЯХІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ», «ЧЫРВОНЫ МАЯК».

У АДКАЗ НА ПАСТАНОВУ ЦК КП(б)Б АБ РАБОЦЕ ПАРТЯЧЭЙКІ КАЛГАСУ ІМЯ СТАЛІНА КАМУНІСТЫ ГЭТАГА КАЛГАСУ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ МАБІЛІЗАВАЛІ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ДАТЭРМІНОВАЕ ЗАВЯРШЭНЬНЕ СЯЎБЫ. СТАЛІНЦЫ ДА 25 КРАСАВІКА ЗАСЕЯЛІ ЎСЕ РАНЬНІЯ ЗБОЖЖАВЫЯ КУЛЬТУРЫ. СЯЎБА ПРАВОДЗІЛАСЯ РАДКОЗЫМІ СЯВЯРКАМІ.

ДА 27 КРАСАВІКА КАЛГАСЫ СЛУЧЧЫНЫ ВЫКАНАЛІ ПЛЯН СЯЎБЫ АЎСА НА 67 ПРОЦ.

МЕНСК

КАЛГАС «КАСТРЫЧНІЦКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ», РАТАМСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. ДА 25 КРАСАВІКА КАЛГАС ЗАСЕЯЎ 195,5 ГА АЎСА (ПЛЯН — 194).

КАЛГАС «БАЛЬШАВІК», КАЛОДЗІШЧАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ. ДА 25 КРАСАВІКА КАЛГАС ЗАСЕЯЎ 118 ГЭКТАРАЎ АЎСА (ПЛЯН — 115).

РАПАРТ КАЛГАСУ „КАМІНТЭРН“

Мы, калгасьнікі с.-г. арцелі «Камінтэрн», Цараўскага сельсавету (Случчына), ударнай работай на палёх, пад кіраўніцтвам райкому КП(б)Б і пры непасрэднай дапамозе палітаддзелу МТС да тэрміну скончылі сяўбу збожжавых культур. Засеяна аўса — 30 га, ячменя — 12 га, гароху — 4 га і раньняй бульбы — 6 га.

Усе збожжавыя культуры на 94 проц. засеяны радковымі сявалкамі. Апрацоўка глебы добраякасная. Замест вызначаных паводле плану 2.650 вазоў гною на палі вывезена 3.600 вазоў.

Мы запэўніваем РК КП(б)Б і палітаддзел МТС, што ня спынімся на дасягнутым і выканаем датэрмінова вызначаны нам плян сяўбы.

Да 1 мая засеем 14 га раньняй бульбы, лён і канюшыну. Такжа засеем адзін «гектар абароны».

Дабіўшы кулака, вытрымім прагульшчыка, па-бальшавіцку будзем змагацца за тое, каб зрабіць кожнага калгасьніка заможным.

Калгасьнікі с.-г. арцелі «КАМІНТЭРН».

САЎГАСЫ ЎВАРАВІЧЫ І СТРЭЛІЧАВА СКОНЧЫЛІ СЯЎБУ РАНЬНІХ

ГОМЕЛЬ, 28. (Па тэлеграфу).

Перадавыя саўгасы гомельскага Малакапрамтрэсту **ЎВАРАВІЧЫ** (Уваравіцкі раён) і **СТРЭЛІЧАВА** (Хойніцкі раён) закончылі сяўбу раньніх збожжавых.

На 27 красавіка саўгас Уваравічы **ЗАСЕЯЎ 100 ГА АЎСА, 10 ГА ЯЧМЕНЮ, 18 ГА ПШАНІЦЫ І 66 ГА ВІКІ.**

Саўгас Стрэлічава засеяў **250 ГА ЗБОЖЖАВЫХ.** Сёньня саўгасы пераключыліся на сяўбу іншых культур. Якасьць палявых работ здавальняючая.

Ударнікі калгасных палеў

АЛЕНА САБАЛЕНКА—ударніца калгасу імя Лекерта (Полацкі р.).

Тав. БІРАГА—брыгадзір ударнік калгасу «Чырвоны Захад» (Дзяржынскі р.).

Тав. ШАЛЬКЕВІЧ—ударніца калгасу «Чырвоная дуброва» (Старадарожскі р.).

ПОЛЕ НЯ ВЕДАЕ АГРЭХУ

Дзень добрых якасьці злучаны ў асобе Андрэя Белага — шаўковы вопыт работы на зямлі і мазады дух, руплівасьць, выклікаюцца да жыцьця светлымі перспэктывамі калектыўнай працы.

Гэта і ўлічала праўленьне калгасу «Ленінскі шлях», калі прызначыла Андрэя брыгадзірам пятай паляводчай брыгады. Стары Андрэй не падвёў праўленьня. Ён увесь свой шматгадовы вопыт, усе свае сілы аддае брыгадзе, вядзе не так, каб заўсёды быць наперадзе.

Яго брыгада першай ня толькі ў калгасе, але і ў сельсавеце выйшла ў поле.

Шалёны сівер зьмяцаў вырваўся з лесу, парваў на шмоцьце ватай нечаканага сьнегу. Па калгасах ад вёскі да вёскі пачаўсь кулацкія шэпты:

— Ня верце бальшэвікам, пакінуце на раньняю сяўбу, сейце пад дух...

Андрэй усёй сваёй істотаю, усімі сваімі сіламі памагаў для таго, каб шматгадовы вопыт супрацьставіць кулацкім шэптам.

— Брэшуць яны, сяўбу спрэчы хочуць. Што там ні кажы, але **АРАЦЬ ПАРА.**

І хоць гроза навісалі над полем хмары, хоць і вецер не слабеў, Андрэй яшчэ з вечара разьмеркаваў сілы сваёй брыгады так, каб заўтра распачаць ворыва.

Раніцой, ледзь золяк, прачнуўся Андрэй. А калі «ходзікі» паказалі «сем», калі Андрэй хаты сабраўся амаль уся брыгада. Не прайшло і дзесяці мінут — кожны ўжо завіхаўся каля сваёй справы. Старшыня Лясьніцкі Пятрок і Белы Царэшка пасхалі на бульбяніцча араць пад ячмень. А маладзейшыя — Лясьніцкі Іван, Мандык Цімох і Анціпенка Амяльян паехалі на поле з боранамі. Жагчыня-ж пайшлі адкрываць капец, перабіраць насеную бульбу. Як дружна сабраліся, так і ўзяліся за работу. Аднак, ня ўсе. Ня прыйшоў Анціпенка Хведар. Спазьніўся мінут на 15, але-ж Андрэй ня спусьціў яму і гэтага:

— Што гэта ты сабе думаеш, хлопча? Такое ўдалое надвор'е, кожная мінута дорага, а ты спаць надумаў.

— Віноват, дзядзька Андрэй... Чэснае слова — больш гэтага ня будзе.

Цэлы дзень Андрэй, ад раніцяга нараду і да вечара, заўзята працуе ў брыгадзе. То з плугам, то з вілкамі, то з лапатай. А вечарам, калі пачне зьмяр кацца, а калгасьнікі сядуць шабашаваць, Андрэй бярэ сваю двухмэтроўку і ў падбежкі ітыць па полю абжераць вучасткі, на якіх удзень працавалі калгасьнікі яго брыгады. Ні адзіны бароўны не праміне стары, возьме на заметку якасьць, а прыпішуны дадому адзначыць усё гэта супроць кожнага прозьвішча ў кнізе ўліку працы пэўнай колькасьцю працадзён.

Скажам, заараў ты на адным капі 60 сотак гэктара — Андрэй табе і паставіць наўтара працадня. І то толькі тады, калі раллі не сапсуеш, агрэху не наробіш.

Не здарма ж поле пятай брыгады ня ведае ні аднаго агрэху. А калі аднаго разу шугар Белы Царэшка сапсаваў раллю, Андрэй прапанаваў яму яе направіць, а сам прыйшоў дадому, узяў кавалак крэйды і хоць ня зусім пісьменна, але выбеў на чорнай дошцы прозьвішча віноватага.

Добра наладжаны ўлік у пятай брыгадзе забясьпечыў у ёй добрасумленныя адносіны да працы, сыстэматычнае выкананьне самых большых у калгасе норм напрацоўкі. У брыгадзе няма прагулаў.

У той дзень, калі спазьніўся на працу Анціпенка Хведар, у час абедзенага перапынку Андрэй сабраў брыгаду і расказаў усім аб гэтым выпадку. Не праміноў сказаць і аб тым, што ва дзень перад гэтым, калі ён, брыгадзір, быў у адлучцы, Белы Пятрэшка ладзеў на «Шэрага» замут ад «Гаручага».

— Так, браты, мы мо, мы ў спаборніцтве з трэцяй брыгадай заадну будзем. Сяўбу ў тэрмін яе скончым.

У гэтак-жа дзень упершыню была выпушчана ў брыгадзе Белага Андрэя насьценная штодзенка. Прачытаўшы яе, брыгадзір сказаў:

— Во, гэта дзела. Яна будзе маім першым памочнікам. Дамо мы з ёй гару гультаём.

***

Брыгада Андрэя Белага першай у сельсавеце прыступіла да сяўбы.

В. ДАЛЬ.

Калгас «Ленінскі шлях», АРШАНШЧЫНА.

РУНЬ НА ПЯСКОХ

Ад Паддабранкі, ад Глубоцкага вялізнай прасторай залягалі сьпучыя пяскі. У веставым крыштальным паветры выразна вырысоўваюцца жусты фільтавага вербалозьня. Здаецца, што толькі адна вярба і можа расьці на гэтай убогай глебе...

Але першыя-ж уражаньні ад калгасу «Пяскі» пачынаюць разьбіваць прычынныя ўяўленьні.

Рад новых будынкаў — скотны двор, павець, пажарны абоз, склеп, парнікі на 98 рам, з памідорнай і капустнай расадай, сталярная майстэрня, кузьня — сьвяцяць ужо аб упартай, пілённай рабоце калгасьнікаў іменна на пяскох.

Пры больш дэтальным азнаямленьні з калгасам вы даведваецеся аб калёкім росьце яго за апошнія-нобудзь два гады. 36 гаспадарак у 1931 годзе — бядняцкі актыў сяла Глубоцкае, — нажалеў у 18 коней для 4 гаротных, без машын, амаль без інвэнтару, — і 173 гаспадарлі сёлета, 120 коней, 191 галава буйной рагатай жывёлы — вось характарныя паказальнікі.

Постаць старшыні праўленьня — бальшавіка, чырвонага партызана Герасенкі, варта асаблівае ўвагі. Сам ён, зьяўляючыся старшынёю калгасу, у той-жа час і сакратар сельсавецкай парт'ячэйкі. Непарушальнага аўтарытэту ў «Пяскох» і наўмал іх ён дабіўся непасрэднай работай у слабейшых вызначных вытвэрчасьцях, асабістым прыкладам і адданасьцю.

Было так: летась у часе касавіцы трэ' было працаваць на балоце, ва Ўрочышчы Вобаў, у непраходнай тэлкі. Тады не хацелі ісьці калгасьнікі. Старшыня, [illegible] — і ён адтуль [illegible] калгасную масу. Балота было вярмежнае.

Цікавы ўзаемаадносіны калгасу з адпасобным сэктарам Глубоцкага. У 1932 годзе, пры ўборцы ўраджаю ў Пяскох не ставала рабочай сілы. Дапамагалі адпасобнікі.

— Па сто жанчын выходзіла на калгасныя палі, — расказваюць калгасьнікі.

І, з другога боку: калгас браў конай ды нарэшце адпасобнікаў на пашу, на свой вучастак. Адпасобнікам вось падаўна дапамагалі пасеньнем грэчкі — далі 50 пудз., пасеньнем ільну. Калі ў бядняцкі - адпасобніцы Аўдоцьці Пазьняковай, удовы, развалілася хата — калгас за свае сродкі адбудаваў ёй новую.

Расьце ў дужае жытар'яльны дабрабыт калгасьнікаў. У 1931 годзе, напрыклад, на дзіцін працадзень прыпадала 6,5 клгр. буйнёны; у 1932 — 10,5 клгр. У перавесьце на грошы першы год існаваньня калгасу даў 1 руб. 17 кап. на працадзень, другі — 1 руб. 63 кап.

Летась набылі 30 фурманак на жалезным ходу, 30 камплектаў новай збруі. Зараз адбудоўваецца сявіран на 24 тоны збожжа, шпаналік на 500 калод пчол, лазьня.

На ўкраіне сяла, дзе сіляліся зялёным ядзлумні хвоіў і пацерка лапоцей, — [illegible] пахам сяла, нідзе [illegible] пасёлак. Прасторныя [illegible] на 100 з лішнім [illegible] узорная чыстата, квіратныя ложкі (свая сталярная майстэрня), чыстая бялізна. Калгасная шмона выхоўваецца на кравоньлі, у здаровых умовах і догляде.

Весьнавую сяўбу Пяскі сустрэлі сёлета на ўсеўобраеньні. Спачатку году [illegible] абрую, пазы. Арганізавалі дзесяць паляводных брыгад.

У пядзёна заканчанай стайні, каля брамы, вісяць кавалак фанэры. На ім:

— Рэйза Тодар — конь «Мартыра», № збруі 3.

— Шелег Пятро — конь «Іцус», № збруі — 27.

— Кавалёў Хаймон — конь «Касак», № збруі — 7.

Тав. СТРАКОЎСКІ—ударнік калгасу імя Леніна (Бер[illegible])

Зима мітусьні пры выезьдзе на поле. Кожны ведае свой пункт, сваю баразну, свайго каня.

Яшчэ ня ўсходзіць сонца, як палявод Ігнат Кавалёнка ідзе на калгасны двор. Конюхі ня сплюць.

— Коніце? — ветліва зварачаецца да іх Ігнат.

— А як-жа, праба, каб коні пашкатове былі! Яны ў нас, пажуць, нто, шы ардэны.

У брыгадзе № 8, дзе брыгадзірам Я. М. Герасенка, — 53 чалавекі. За брыгадай замацавана 15 коней, столькі-ж вазоў, 9 чапугоў. Вытворны плян на брыгадзе ведае кожны. Вытворчыя вучасткі на ўвесь час пяцігодзьдзя севазвароту замацаваны ўжо за брыгадаю. Ня тоўп і ў іншых брыгадах.

Пагаворце з лепшымі ўдарнікамі «Пяскоў» — А. Крукавым, М. Хаймоном, Т. Кушнэровай, Н. Андрэйчыкавай. Яны надзелены з вамі сваім вопытам, расказуць пра тое, як на сярэдзевых пяскох вырастае кушнстая руць, як цьвітуць калгасныя палеткі маладымі, буйнымі ўсходамі.

Калгасныя палі «Пяскоў» мяжуюць з палямі Дабранскага раёну, з УССР. Ацтуль, з Украіны, як і з суседніх калгасаў Краўцоўскага, Горгуноўшчыны, Маражэйжага сельсавету, прыяжджаюць людзі, каб азнаёміцца з пастаноўкай справы ў калгасе, што вырас на пяскох, і перанесьці вопыт пяскоўнаў на свае сядзібы.

Падзелы, праслым [illegible] калгасьнікаў [illegible] Ленінграду, Масквы і УССР і г. І. Петроўск. Пяскоўны замоўлені яго.

— Сёньня ў веснавой сяўбе выкажам сваё [illegible]. Абяцаем бязьлітаснаю вайну рашткам гультайства, неахайнасьці, абыякавасьці. Злабытых пазыцый не здамо!

І сапраўды бальшавіцкім змаганьнем за ўраджай, за поспехі першай вясны другой пяцігодкі «Пяскі» дазваляюць цвёрдзьвае ажыцьцяўленьне ўзятых на сябе абавязкаў.

Недарма ўжо на 21 красавіка калгас цалкам засеяў вызначаныя [illegible] гэктары аўса, пшаніцы, ячменю, учараў 9 га пад пратку. Недарма на 1 мая калгас перавышае пасеў бульбы (замест 93 га — 105).

Сьпучыя пяскі Глыбецкаўшчыны, асвоеныя поспехі людзьмі, робяцца новай глебай, якая здольна дзьмець на бывалыя ўраджаі. Пяскі перамаглі!

ЮР. ЛЯВОННЫ.

Пятрусь Броўка

НАША БАЦЬКАЎШЧЫНА СССР

1.

Там пад стэпам
[illegible]каў іх ад [illegible] пажар;
[illegible] сонцу там горача,
[illegible] і песьня.
[illegible]аськаў
[illegible]жаны тар,
[illegible] сьпявалі
[illegible] песьню.
[illegible]х чатыры:
Серго Каўтарадзэ,
Тарас Піліпенка,
Алі Джасур
і Базыль Каляда

[illegible]ых дзяцінай
[illegible]
[illegible] шахтах забой,
[illegible] сьпявалі ім
[illegible]нтуючая сонца,
[illegible]
[illegible]
[illegible]

ПЕРАМОЖНА ЗАВЕРШАНА ПЕРШАЯ БАЛЬШАВІЦКАЯ ПЯЦІГОДКА ЗА 4 ГАДЫ

НЯХАЙ ЖЫВЕ ДРУГАЯ ПЯЦІГОДКА ПАБУДОВЫ БЯСКЛЯСАВАГА ГРАМАДЗТВА!



Перадавікі па выкананьню прамфінпляну рапартуюць аб першамайскіх перамогах

Менск, ЦК КП(б)Б, тав. Гікало

БАРЫСАЎ. Дзякуючы рашучай барацьбе за генэральную лінію партыі, бальшавіцкім мотадам работы, якімі ты, тав. Гікало, вучыш нас і ўсю беларускую партыйную арганізацыю, мы, пралетары Барысаўшчыны, да дня 1-га мая і чацьвертай гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва, табе, непахіснаму бальшавіку, рапартуем: на аснове пастаноў студзеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), лютаўскага і сакавіцкага пленумаў ЦК КП(б)Б, пад жалезным бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, мы, рабочыя інжынэрна - тэхнічны і адміністрацыйны пэрсанал гораду Барысава, **абвясьціўшы месячнік штурму прарываў** па выкананьні прамфінпляну за першы квартал, з гонарам выканалі свой абавязак перад працоўнымі СССР. Прамфінплян за чатыры месяцы **выканан:** па дрэваапрацоўчым камбінаце **«Камінтэрн»** на 100,5 проц., **Бярэзінскім** камбінаце — 100 проц., гуце імя **Домбаля** за першы квартал 92 проц. і за першы месяц другога кварталу 110 проц., па фанэрным заводзе **«Камінтэрн»** — 100,8 проц., лесазаводзе імя **Молатава**—100,2 проц., лесазаводзе імя **Розы Люксэмбург** — 110,41 проц.

Прамфінплян усімі прадпрыемствам і **Барысава** выканан на 100,3 проц. За **штурмавы месяц** барацьбы за права на рапарт тав. Гікало — на 112,4 проц.

Заяўляем табе, тав. Гікало, што мы ўзятых тэмпаў не здамо і на аснове дасягнутага выкананьня прамфінпляну бальшавіцкай работай будзем множыць нашы перамогі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Няхай жыве кіраўнік і арганізатар кастрычніцкіх перамог—слаўная бальшавіцкая партыя і яе ленінскі ЦК на чале з тав. Сталіным!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало!

80 ПОДПІСАЎ.

* * *

ЦК КП(б)Б ТАВ. ГІКАЛО; СНК БССР ТАВ. ГАЛАДЗЕДУ; НАРКАМЦЯЖПРАМУ ТАВ. АМБРАЖУНАСУ; ЦО КП(б)Б ГАЗЭЦЕ «ЗЬВЯЗДА»

Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і СНК, пры дапамозе мясцовых партыйных арганізацый, у дзень 1 мая будзе здан у эксплёатацыю фібрапітавы завод магутнасьцю ў 42.000 квадратных мэтраў фібраліту.

Рабочыя і тэхнічна-адміністрацыйны пэрсанал запэўняюць ЦК і СНК, што поўнасьцю аўладаюць праектнай магутнасьцю заводу.

АД імя рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу:
Дырэктар заводу КАЗІНІК.
Сакратар ячэйкі КП(б)Б ЕМЕЛЬЯНАЎ.
Старшыня заўкому ПІСЬМАН.

Адказваем поўным выкананьнем прамфінпляну

Праводзячы ў жыцьцё 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, абутковая фабрыка імя **Тэльмана** падыходзіць да сьвяткаваньня 1-га мая з наступнымі паказальнікамі: прамфінплян першага кварталу выкапан на **114,5 проц.**, прадукцыйнасьць працы—**107** проц., зьніжэньне сабекошту супроць пляну **7,8** проц. Дасягнутых посьпехаў рабочы калектыў фабрыкі ня здаў і ў першым месяцы другога кварталу. За 22 дні красавіка прамфінплян выкананы на **113,3** проц. **Па хадайніцтву агульнага калектыву фабрыкі, яна перайменавана з «Уцільскур» у абутковую фабрыку імя Тэльмана.**

Рабочыя адказалі на перайменаваньне фабрыкі ўздымам прадукцыйнасьці працы, паляпшэньнем якасьці, асваеньнем перагледжаных норм і

У гонар тав. Тэльмана арганізавана 6 ударных і 4 гаспадарча-разрахунковых брыгады.

Тав. ВАСІК—рабочы-ударнік эмв. «Камунар».

на 1½ проц. 35 рабочых фабрыкі абвясьцілі сябе ўдарнікамі і ўступілі ва ўдарныя брыгады. Мы абавязваемся дасягнутыя посьпехі замацаваць і ў далейшым яшчэ з большай энэргіяй і энтузіязмам змагацца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну першага году другой пяцігодкі па ўсіх паказальніках.

Дырэктар фабрыкі АСС.
Сакратар ячэйкі КП(б)Б ШТЭЙМАН.
Старшыня фабкому БРУДНЭР.

Янка Купала

Май

Ходзіць май па сьвеце,
Сонцамі ўрэзіцца,
Закаваных, сьпячых
Кліча ўстаць, збудзіцца.
Далятае голас
Вялікага сьвята
У нетры сутарэнняў,
У курныя хаты.

* * *

Ходзіць май па сьвеце,
Сьцяг яго чырвоны.
Патрасае грозна
Троны і кароны.
І дрыжаць сатрапы,
Цары і царысты
Ад находаў майскіх,
Заклікаў апісітых.

* * *

Ходзіць май па сьвеце,
З думкаю расьпетай:
Возьмуць на ўсім сьвеце —
Возьмуць верх Саветы.
Чырванью шаўковай
Запэўнуць штандары, —
Хто ў няволі гнуўся —
Устане гаспадарыць.

* * *

Ходзіць май па сьвеце
Многалюдны, буйны,
І складае песьні
Сусьветнай Камуны.
Чалавек ня будзе
Ужо над чалавекам
Панаваць крывава,
Як дасюль — з прадвекаў.

* * *

Ходзіць май па сьвеце...
Менск, 19-IV 33 г.

Андрэй Алексюк

ПЕСЬНІ ПЕРШАМАЯ

(1933)

Змрокаў цень
З вока зьдзень,
Першамайскі крочыць дзень!
Весьнавой зары далонь
Рассыпае свой агонь.
Ён разьліваны ў вачох—
Грае славай перамог
Зьяе дружбаю людзей
Бальшавіцкіх дум і дзей.

Сонца сее марш фанфар
Разгарнуўшы паш—штандар.
З чатырох зямлі старон—
Вяшчуном вялікіх дзён
Грозна-ўздыбленых падзей—
Першамайскі дзень ідзе.

А чаго-ж—на берагу
Іх зямлі—шалёны гул?
— Скача шал крыві ў галён,
Раз астатні арасьць згроб
Залаты атрутны труп,
Мкне граніцы зьнішчыць слуп.

Наша клясавая брань—
Першамайскі наш агонь!
Ён — мяцеліцай зарніц,
Кругам сонца, без гранід,
Гулам рокатных навал
Свой спраўляе карнавал!

II.

Выезд любімага намі паркома,
У зьвеях салюту, з варотаў Крамля —
Перарастае — ў рокаты грому
Там—дзе ад веку расьпята зямля.

Важка і горда, як голас народу,
Гучыць перамогай прысяга байцоў.
Рэе Кастрычніцкі сьцяг пяцігодак,
Соцочным поступам бальшавікоў.

Ля маўзалея ўрачыста з трыбуны
Братніх рэспублік, таварыш Урад,
Армії нашай сусьветнай Камуны
Клічам вітаньня прымае парад.

Рупіцца копьніца волатаў-танкаў,
Гулам танкетак бягуць табуны.
Нават прамені на аўта-тачанках
Вартай зэнітак,—дазорцы вясны!

Рэжуць бязьмежжа надхмарнае трасы
Крыльлямі сталі вышынь караблі.
Як дэлегаты —рабочае клясы,
Росквіту нашага—нашай зямлі!

Чоткая чутна матораў работа,
Плаўна ўскрыляецца броневы мост.
Рота за ротай, руш — разваротам!
СТАЛІНізована армії моц!

III.

Мы—моцныя, мы—дужыя,
Мы — шторму бурны шквал!
Гарыць братэрскай дружбаю
Калён мільённых вал!

Мацнеем год за годам мы,
Шагае — з краю ў край —
К нам новымі заводамі
Таварыш Першамай!

Рэспубліка савецкая,
Твая ў красе вясна!
Няма даляру дзецца, як —
Уздыблена сканаць.

За зьменай зьмена—ў дзьве рукі,
У песьнях бур — крылай!
Пакрылі тэмп Амарыкі,
Таварыш Першамай.

У высь, у высь! Нам дорага
Хвіліны кожнай крок.
Кідай свой зрок на ворага,
І палец—на курок.

Гарым братэрскай дружбаю,
Агонь шырэй раскінь!
МЫ — МОЦНЫЯ, МЫ — ДУЖЫЯ,
БО МЫ —
БАЛЬШАВІКІ.

Нашае першамайскае абавязацельства

Мы, ударнікі чырвонасьцяжнай паляровай фабрыкі «Герой працы», сафраўшыся на зьлёт для падвядзеньня вынікаў месячніка штурму, з гонарам заяўляем, што пад выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнай партыі на чале з правадыром партыі і сусьветнага пралетарыяту т. Сталіным, пры непасрэднай дапамозе брыгады ЦК УсеКП(б) на чале з сакратаром ЦК КП(б)Б тав. ЖАБРОЎСКІМ, пры штодзённых клопатах і ўвазе ЦК КП(б)Б дабіліся ліквідацыі прарыву: замест 60 тон паперы за дзень даем 100 тон, замест 14 тон цэлюлёзы — даем 28. Зьлёт бярэ на сябе абавязацельствы замацаваць узятыя тэмпы, палепшыць якасьць, цьвёрда прытрымліваючыся стандарту, на працягу другога кварталу заняць першае месца сярод перадавікоў [illegible] як па колькасьці, так і па якасьці выпускаемай прадукцыі. Месячнік штурму паказаў, што ўсе ўмовы для гэтага ёсьць. Заленьць усё ад арганізацыі справы, ад людзей, ад нас, — ударнікаў. Заяўляем, што цьвёрда ажыцьцяўляючы 6 умоў тав. СТАЛІНА, узятыя на сябе абавязацельствы выканаем з гонарам.

Няхай жыве камуністычнае спаборніцтва — шлях да выкананьня прамфінпляну!

Няхай жыве камуністычная партыя!

Няхай жыве тав. СТАЛІН — правадыр сусьветнага пралетарыяту!

ПРЭЗЫДЫУМ.

Прамфінплян 1933 г. будзе выкананы

РЭЧЫЦА. Фанэрны завод імя Галадзеда атрымаў бальшавіцкія перамогі. Прамфінплян першага кварталу фанэры выканан на 105 проц. і па экспарту на 101.

За дзве дэкады красавіка плян на экспарту і заналках выканан на 102 проц. Гэтых перамог камбінатаўцы дабіліся дзякуючы шырока-разгорнутаму сацспаборніцтву і ўдарніцтву.

Рабочы калектыў, ІТР і трыкутнік камбінату запэўняюць партыю і урад, што, не аслабляючы тэмпаў барацьбы за плян першага году другой пяцігодкі, задачы, пастаўленыя перад камбінатам, ім ў тэрмін выканаюць.

Трыкутнік.

Фрыц Гекерт

Да першага мая

Калі 44 гады таму назад на ўстаноўчым кангрэсе II Інтэрнацыяналу ў Парыжы прымята была пастанова абвясьціць Першага мая міжнародным баявым днём сусьветнага пралетарыяту і спыніць на гэты дзень работу—напэўна ніхто не прадчуваў, што ў адзін прыгожы дзень зьлейшыя ворагі рабочае клясы абвясьцяць 1-га мая нацыянальным сьвятам. Аднак, здарылася іменна так, у гітлераўскай Германіі, дзе пануе дыктатура найгоршых элементаў і прыгнятальнікаў працоўных мас, гэта самая дыктатура абвясьціла пралетарскі баявы дзень днём перамогі над пралетарыятам. Гісторыя пюфіць гратэскі. Але сацыялісты, устанаўляўшыя першамайскае сьвята, яшчэ менш маглі чакаць другога факту, які, аднак, таксама адбыўся, а іменна: што правадыры рэфармісцкіх прафсаюзаў згодзяцца з такога роду першамайскім сьвятам, які праводзіць зараз Адольф Гітлер. Раней рэфармісцкія правадыры не адносіліся з такім энтузіязмам да 1 мая, яны лічылі, што ахвяры, якія прыходзіцца прыносіць рабочым для правядзеньня першамайскіх дэманстрацый, занадта вялікія. Цяпер-жа праўленьне Усягерманскага аб'яднаньня прафсаюзаў (АДГБ) абяцае фашызму заблысьпечыць удзел рабочых прафсаюзаў у сьвяткаваньні фашысцкай перамогі. Ахвяра прынцыпамі, якую прыходзіцца пры гэтым прыносіць германскім прафпровадыром, далёка не такая вялікая, як тыя ахвяры, якія прыходзілася шмат гадоў назад прыносіць пралетарам, сьвяткаваўшым 1-га мая і плаціўшым за гэты ўдзел эвальненьнем з работы, а часта і турмой.

Калі-б усяго некалькі месяцаў таму назад германскіх прафпровадыроў абвінавацілі ў тым, што яны будуць разам з Гітлерам сьвяткаваць 1 мая,— яны, зразумела, з найвялікшым абурэньнем назвалі-б такое меркаваньне маскоўскім пакёпам. Аднак, бальшавіцкія прадказаньні аб сацыял-дэмакраты і яе правадырох адзначаюцца вельмі пэўнай тэндэнцыяй: ператварацца з «пакёпу» ў гістарычную праўду.

Для таго, каб мець магчымасьць прыняць удзел у зьдзеках над пралетарскім першамайскім сьвятам у лягеры Гітлера, старшыня Усягерманскага аб'яднаньня прафсаюзаў Тэодар Лейпарт пакінуў свой пост старшыні Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу прафсаюзаў, а намесьнік яго па АДГБ, Пётар Грасман, яшчэ да таго хушэнька ўбраўся і з сацыял-дэмакратычнай партыі.

Гэтыя паны відавочна, лічаць, што сучасная кан'юнктура дыктуе ім сьледаваць за Гітлерам, таксама як нядаўна за Генры Фордам, а раней за Карлам Марксам.

Ніколі яшчэ ня бачыў сьвет такой [illegible] комедыі, як від гэтых «прыхільных» пралетарыяту рабочае клясы—так самапрыўнена называлі сябе амстэрдамцы—якія міган ператварыліся [illegible] рабочых дадзены падняволеных народаў, цягнуцца за трыумфальнай калясьніцай Гітлера і славасловяць яго.

Можна было-б думаць, што гэта палітычная сьмярць адной з буйнейшых арганізацый II Інтэрнацыяналу і Амстэрдамскага інтэрнацыяналу прафсаюзаў, таксама, як і маральная загубства германскіх рэфармісцкіх правадыроў, прадстаўляе сабой адзінае ў сваім родзе і выключна германскае зьявішча. Аднак, вядома, што гэта ня так. Мы зьяўляемся зараз сьведкамі паўтарэньня гісторыі 4 жніўня 1914 году ў павялічаным маштабе. Да дакага выпадку зусім падыходзяць словы Маркса: «Гісторыя любіць паўтарэньні вялікіх падзей. Адзін раз яны разыгрываюцца, як трагедыя, другі раз— як фарс». Такі фарс мы зараз перажываем. Ітое, што расквітнела ў Германіі пышным цьветам, ёсьць у зародышы ў рэфармісцкім руху ўсіх краін. Дый ня толькі ў зародышы, а ўжо на пэўных ступенях разьвіцьця.

Такое-ж бахвальства, як у радох германскіх рэфармістаў, чулася ва ўсім II Інтэрнацыянале, таксама, як і ў Амстэрдамскім. Ня многа тыдняў прайшло з таго часу, як амстэрдамцы разгарнулі вельмі шырокавяшчальную кампанію—па ператварэньні капіталістычнай гаспадаркі ў сацыялістычную. Што ад яе засталося? Куча гною, пра якую ўжо ўсе пеўні забыліся. Потым пасьпеў вапа абвяшчэньне міжнароднай барацьбы за ўвядзеньне 40-гадзіннага рабочага тыдню з выраўноўваньнем зарплаты, як адзінага спосабу перамаганьня беспрацоўя і крызісу. 1 мая 1933 году павінна было быць кульмінацыйным пунктам гэтай кампаніі. У лягеры сацыял-дэмакратыі і Амстэрдаму ніхто больш і аб гэтай кампаніі не гаворыць. Паном Фрыдрыхам Адлерам, Отто Бауэрам, Вандэрвэльда, Сітрынам, Жуо, Шэвенэльсам і ўсім іншым сьветачам рэфармізму не да таго,—у іх ёсьць справы больш важныя. Зараз ім важна як можна больш грунтоўна ўмацавацца ў лягеры сваёй буржуазіі і, прыкрываючыся шапёнай паяннай на адрасе нямецкіх здрадзікаў, падрыхтавацца да такіх-жа геройскіх учынкаў, як і гэтыя здрадзікі. Гэта таксама зьяўляецца паўтарэньнем мэтаду, які ўжываўся ў 1914 годзе. Розьніца заключаецца толькі ў тым, што ў 1933 годзе будзе ня так лёгка нажыць сабе палітычны капітал і адурманіць масы гэтымі ўзаемнымі абвінавачаньнямі, як у той час.

Рабочыя ўсё лепш разумеюць манэўры сацыял-фашыстаў, якія ўжываюцца імі для разьбраеньня рабочай клясы і зьбіваньня яе з правільнага шляху. Зусім яшчэ нядаўна здавалася, што амстэрдамцам і II Інтэрнацыяналу ўдасца адурманіць масы з дапамогай манэўру ў сувязі з пактам аб ненападзе. Але тут падасьпелі германскія падзеі. Паны Вэльс і Лейпарты ўзарвалі з вэнутры хітра абдуманы манэўр. Ды інакш і быць не магло. Становішча германскай буржуазіі ў рэзультаце сусьветнага крызісу стала такім, што яна больш ня ў стане прадастаўляць сацыял-дэмакратыі магчымасьць праводзіць шырокія манэўры. Буржуазія замяніла сваю ранейшую тактыку манэўраваньня тактыкай [illegible] адносінах да пралетарыяту. Гітлер са сваімі штурмавікамі больш прыгодны для правядзеньня гэтай тактыкі, чым Вэльс з рэфармісцкімі прафпровадырамі, саюзам рэспубліцкага сьцягу і жалезным фронтам. Таму стаўшы нарэшце годнай зброй выкінута на сьметнік, а з ёю разам і яе рыцары. Сумныя рэшты [illegible] рэфармісцкага парыяду, як блукаючыя [illegible], яшчэ зьмуляюцца то там, то тут у [illegible] пралетарыяту. Але навальніца, [illegible] жаецца, разагнаўшы туман [illegible] карысьці супрацоўніцтва клясаў, разгоніць і гэтыя балотныя агні. Усім клясасьцям, усім «праслойкам» прыходзіць канец: можна стаць толькі або з таго, або з гэтага боку барыкады.

Буржуазія думала, што ёй удасца ў момант цяперашняга крызісу, нанесьці рабочай клясе рашаючы ўдар, зьнішчыўшы яе авангард—кампартыю і рэвалюцыйную прафпазыцыю. Гэтага ёй зрабіць не ўдалося. КПГ і РПО — жывуць. Галоўны ўдар ня трапіў у цэль. Затое ўдар на другарадным вучастку фронту паў з сакрушальнаю сілай: германская сацыял-дэмакратычная партыя і АДГВ разгромлены. Іншымі словамі—буржуазія ў сваім шалёным наступленьні на пралетарыят зруйнавала тую самую плаціну, якая з 1918 да 1933 году выратоўвала яе ад барышэвізму, і тым самым зруйнавала таксама важнейшыя зьвеньні міжнароднай «плаціны»—Другога і Амстэрдамскага Інтэрнацыяналаў. Сусьветная буржуазія не падэкую за гэта сваёй германскай сястры. Рэвалюцыйныя хвалі, якім мерапрыемствы Гітлера расчысьцілі шлях у Германію, паднімаючыся ўсё вышэй і вышэй—перахлісьнуць праз Рэйн.

Каб нанесьці ўдар КПГ, буржуазіі прышлося скінуць усе дэмакратычныя маскі і даць Гітлеру права на самую ярасную дэмагогію. Усе дэмагагічныя абяцаньні, якія толькі можна было зрабіць, былі зроблены Гітлерам. Цяпер прышоў час для расплаты па гэтых вэксэлях—і хутка, хутка выявіцца, што германскі фашызм прадстаўляе сабой квінтэсэнцыю сацыяльнай рэакцыі і ў той-жа час простым шляхам вядзе да вайны. Ён патрэбен быў буржуазіі для таго, каб скараціць беспрацоўе і дзяржаўны дэфіцыт; ён уплыў вырашэньне гэтых праблем сваёй асноўнай задачай, якую абяцаў выканаць і ня выканаў. Ні ён, дый ніякі іншы капіталістычны рэжым ня ў стане больш вырашыць гэту задачу.

Гітлер павінен кінуць усякую надзею на паляпшэньне эканамічнага становішча. Блеф першых дзён яго ўладаньня выкрыт; усе хісцкія надзеі на буду чае пахаваны назаўсёды падзеньнем амэрыканскага даляра. Хутка расьсеюц ца ўсе мары аб будучыні новай імпэрыялістычнай Германіі, навеяныя «нацыянальнай рэвалюцыяй». Пачвара эканамічнай катастрофы больш грозная, чым калі-б там ні было, паднімае ў Германіі сваю галаву. Ніхто яшчэ ня можа прадказаць глыбіні пад'зеньня германскага капіталізму ў бліжэйшый тыдні. Адно можна сказаць з упэўненасьцю—што падзе ён вельмі нізка.

Што-ж будзе рабіць Гітлер, апошні ратавальнік буржуазіі? Як здолее ён супакоіць сваіх крэдыторaў? На зьнешня-палітычным фронце ён церпіць паражэньне за паражэньнем. З Рыму, сьвяшчэнага гораду фашызму, фон-Папэн і Герынг вярнуліся, таксама, як Людэндорф восеньню 1918 году пасьля панесенага ім паражэньня на другой лініі ўмацаваньняў. Нават дапучэньне (аншлюс) Аўстрыі, фігавы лісток для прыкрыцьця фашысцкай агаленасьці, яне і бляднее. Апосталы Гітлера не пажнуць ляўраў ні на якой канфэрэнцыі па разэбраеньні, ні на якой сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі. Зараз час такіх канфэрэнцый прайшоў. У сувязі з падзеньнем даляру посьпехі германскай аўтаркіі перавысяць самыя сьмелыя жаданьні найбольш гарачых яе прыхільнікаў. Тымчасам апошнія запатыя зьліткі з банкаўскіх падвалаў пусьціліся ў дарогу, але без зваротнага білету.

Як бы ні выкручваўся Гітлер, «пось-пехі яго сыстэмы ўжо прайшлі, цяпер пачынаецца пахмельле. Вядома, у яго ёсьць яшчэ сілы для правядзеньня новых тэрарыстычных мерапрыемстваў — і ён, зразумела, шырока скарыстае гэтыя сілы. Яшчэ нямала рабочых расстраляна будзе «пры спробе ўцякаць»; нямала кпясавых эмігрантаў, перайшоўшы праз Галгофу, падрыхтаваную ім трэцяй імпэрыяй, будзе кінута ў лягеры канцэнтрацыі. Але тэрор на дасьць фабрыкантам новых заказаў, а беспрацоўным работы. Высокая кан'юнктура, якая базуецца толькі на плянковай (авяровачнай) прамысловасьці ды на выробе трупаў,—доўга ўтрымацца ня можа.

Такавы пэрспэктывы германскага фашызму да яго першамайскага сьвята, якое разам з ім будуць сьвяткаваць сьпіўкі II Інтэрнацыяналу, правады германскай сацыял-дэмакратыі і АДГБ. Мы ўжо гаварылі аб тым, што Лейпарт і Грасман у гэты дзень прымуць, як жывы труп, удзел у сваіх упасных хаўтурах. Ці значна адрозьніваецца ад іх становішча тых, якія ўскладаюць надзеі на глашатая адраджэньня капіталізму—Гітлера?

Першае мая было, ёсьць і будзе днём барацьбы рэвалюцыйнага пралетарыяту. Яно ня можа стаць днём перамогі адроджанага ўладарства буржуазіі. Авангард германскага пралетарыяту на гэты раз 1 мая ня будзе сустрэнуты яраснымі сьцісканымі кулакамі ў нішчэнных Аб'яднаных пад сьцягамі КПГ гер. [illegible] сніх пралетары працягнулі адзін другому руки, гата ня да барацьбы з буржуазіяй. З цьвердай рашучасьцю і найвялікшай рэвалюцыйнай упэўненасьцю ўзяліся германскія камуністы за работу. Яны не разьбіты, іх шансы на ажыцьцяўленьне рэвалюцыйнага адзінага фронту пралетарыяту ніколі яшчэ на былі настолькі вялікія, як у гэты год перамогі Гітлера. КПГ стала апошнай усіх чэсных нямецкіх [illegible]

КПГ з подпольля здолее стаць адзіным праводыром гэтых мас у [illegible] заваленчай барацьбе супроць фашызму, калі 1-га мая 1929 году было перадзьвер'ем эпохі найгнылейшага ўніжэньня германскага рабочага руху, дык гітлераўскае 1 мая 1933 году стане пераддзьвер'ем яго новага ўздыму. Уздым гэты будзе цяжкі, мучацельны, але пераможны. Няхай Гітлер, таксама як і Цэргібэль — кожны на свой пад— апаганьвае 1 мая. Адольф Гітлер загіне таксама, як загінула сацыял-дэмакратыя пасьля апаганьвання Цэргібэлем 1 мая.

1 мая можа дацьць жыцьцё і спу толькі камунізму, але ніяк не фашызму. Наперад, у наступленьне на барацьбу за перамогу камунізму закліканьне нашы фанфары першага мая ва ўсім сьвеце і асабліва ў Германіі.

ІМПЭРЫЯЛІСТЫ РЫХТУЮЦЬ НОВЫЯ ВОЙНЫ, РЫХТУЮЦЬ НАПАД НА СССР

ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, АБАРАНЯЙЦЕ КРАІНУ САВЕТАЎ—БАЦЬКАЎШЧЫНУ ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СЬВЕТУ! ДАЛОЎ ПРАВАКАТАРАЎ ВАЙНЫ! НЯХАЙ ЖЫВЕ РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ БАРАЦЬБА РАБОЧЫХ СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ!

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ—АРМІЯ МІЖНАРОДНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ

1-га мая г. г. у СССР праходзіць у абстаноўцы гігантскага росту народнай гаспадаркі, росту дабрабыту шырокіх



працоўных мас гораду і вёскі. Нашы посьпехі—посьпехі міжнароднага значэньня. Нашы перамогі—перамогі працоўных усяго сьвету. Вось чаму рабочая кляса ўсяго сьвету «радуецца посьпехам рабочай клясы ў СССР і гатова аказаць ёй падтрыманьне на страх буржуазіі ўсяго сьвету» (Сталін).

На варце мірнай працы рабочых і працоўных сялян СССР стаіць верны вартовы—наша слаўная Чырвоная армія. Яна пільна ахоўвае межы бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету, і ў дзень 1-га мая гучна раздасца кліч прыгнечаных і эксплёатаваных: «Няхай жыве Чырвоная армія».

У адказ на гэты кліч маладыя байцы Чырвонай арміі—«сыны працоўнага народу» будуць прысягаць на вернасьць уладзе рабочых і сялян, на вернасьць рабочай клясе ўсяго сьвету.

За апошні час як з боку імпэрыялістаў Усходу, так і імпэрыялістаў Захаду ўсё часьцей і часьцей паўтараюцца розныя правакацыі. Гэта патрабуе ўзмацненьня нашай увагі і клопатаў аб Чырвонай арміі, патрабуе ўмацаваньня вайсковай работы ў грамадзянскіх арганізацыях. Сьледам за маладымі байцамі, якія сёньня даюць прысягу, сьледам за ўсёй Чырвонай арміяй усе працоўныя нашай краіны скажуць: «Рукі прач, на ўсякія пасягальні адкажам жорсткім і сакрушальным ударам».

Наша Чырвоная армія—армія рабочых усіх краін. Яна—востра адточаны меч пралетарскай дыктатуры і сусьветнага пралетарыяту. «Сіла нашай Чырвонай арміі заключаецца ў тым, што яна выхоўваецца з першага-ж дня свайго існаваньня ў духу павагі да другіх народаў, у духу павагі да рабочых усіх краін, у духу захаваньня і замацаваньня міру паміж краінамі. І іменна таму, наша армія зьяўляецца арміяй сусьветнай рэвалюцыі, арміяй рабочых усіх краін». (Сталін).

Уладзімер Ільіч Ленін заўсёды і пастаянна адзначаў і падкрэсьліваў інтэрнацыянальны характар Чырвонай арміі. На ўсерасійскім зьезьдзе працоўных казакаў (1 сакавіка 1920 г.) пасьля перамог на Поўначы і на Поўдні ён характарызаваў гэтыя перамогі Чырвонай арміі, як заваёвы» ня толькі нашай краіны, але і ўсіх краін усяго чалавецтва». 15 кастрычніка 1920 году на нарадзе старшынь павятовых, валасных і сельскіх выканаўчых камітэтаў Маскоўскай губэрні Ул. І. Ленін, гаворачы аб перамогах Чырвонай арміі на польскім фронце, адзначыў: «Савецкая Расія летам 1920 г. выступіла ня толькі як сіла, якая абаране ад гвалту, ад націску польскіх белагвардзейцаў, яна выступіла на справе, як сусьветная сіла, здольная зьнішчыць вэрсальскі дагавор і вызваліць сотні мільёнаў людзей у большасьці краін зямлі. Вось значэньне таго паходу Чырвонай арміі, які адбыўся гэтым летам».

Наша Чырвоная армія пішні раз даказала свой інтэрнацыянальна-клясавы характар у цяжкім выпрабаваньні, навязаным нам імпэрыялістамі на Ўсходзе ў 1929 г. Працоўныя масы Кітаю, ня гледзячы на шалёнае цкаваньне, ня гледзячы на запалохваньні буржуазнага друку, наглядна пераканаліся, што наша Чырвоная армія ёсьць армія, для якой існуе адзін толькі вораг: буржуа, памешчыкі, імпэрыялісты. Працоўныя ўсяго сьвету наглядна пераканаліся, што Чырвоная армія—армія міжнароднага пралетарыяту.

І тым больш будуць радавацца рабочыя, сяляне, усе прыгнечаныя зямной кулі ў дзень 1-га мая г. г., ведаючы, што наша Чырвоная армія стала яшчэ больш моцнай, дзякуючы перамогам першай пяцігодкі. Разам з Чырвонай арміяй, разам з працоўнымі СССР, працоўныя ўсяго сьвету будуць радавацца таму, што «з краіны слабай і непадрыхтаванай да абароны, Савецкі саюз ператварыўся ў краіну магутную ў сэнсе абароназдольнасьці, у краіну гатовую да ўсякіх выпадковасьцяй, у краіну, здольную вырабляць у масавым маштабе ўсе сучасныя сродкі абароны і забясьпечыць імі сваю армію ў выпадку нападу звонку» (Сталін).

Наша Чырвоная армія зараз зусім не падобна на Чырвоную армію мінуўшых гадоў. Чырвоная армія на базе пасьпяховага росту нашай індустрыі тэхнічна пераўзброена. Яна мае ручныя, авіяцыйны і танкавы кулямёт, свае кулямётныя зэнітныя ўстаноўкі. Яна мае самазарадную і аўтаматычную вінтоўку, кулямёт-пісталет, аўтаматычны пісталет. Яна мае новых сыстэм цяжкую і зэнітную артылерыю, сучасныя танкі, сучасныя авіяцыйныя маторы. За першую пяцігодку адрамантаваны судны, праведзена ненакітная мадэрнізацыя лінейных карабляў, узмоцнены падводны флёт і берагавая абарона.

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ СТАЛА ВЯЛІЗАРНЕЙШАЙ МАРАЛЬНАЙ І МАТАРЯЛЬНАЙ СІЛАЙ, ЯКАЯ АХОЎВАЕ НЯ ТОЛЬКІ МЕЖЫ АЧАГА СУСЬВЕТНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ—СССР, АЛЕ І АБАРАНЯЕ ПРАЦОЎНЫХ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН АД НОВАЙ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ. ВОСЬ У ЧЫМ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА МІЖНАРОДНЫ, ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ХАРАКТАР РОСТУ ВАЕННАЙ МАГУТНАСЬЦІ СССР І ЯЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

Чырвоная армія, аснашчоная новай тэхнікай, ні на мінуту не забывае аб чапавеку, які павінен быць абсалютна надзейным абаронцам справы сацыялізму. «У нас можа быць шмат добрай зброі, але калі мы ня будзем мець сапраўднай сваёй Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, калі наша армія ня будзе складацца з адданых пралетарскай рэвалюцыі палітычна моцна падкаваных,

добра ведаючых сваю справу камандзіраў, палітработнікаў і байцоў,—вораг адбярэ ў нас гэту зброю; ніякая тэхніка не дапаможа нам абараніць нашу вялікую краіну». (Варашылаў).

Тав. Варашылаў у сваім дакладзе аб 15-годзьдзі Чырвонай арміі прыводзіў надзвычай яркія лічбы, якія характарызуюць зьмены ў сацыяльным складзе РСЧА. У 1921 годзе ў арміі было: рабочых 18 проц., сялян 71 проц. і іншых 11 проц. У 1928 годзе рабочых стала 21 проц., сялян 67 проц. і іншых 12 проц. У 1933 годзе мы маем ужо рабочых 43 проц., сялян 47 проц. і іншых 10 проц. 72 проц. усіх сялян, што знаходзяцца ў арміі — калгасьнікі. У 1933 годзе мы маем у складзе РСЧА 35 проц. членаў і кандыдатаў партыі, 24 проц. камсамольцаў.

Камандны склад Чырвонай арміі так сама вырас. Касьцяком, галоўнай масай камандзнага складу зьяўляецца камандзір, народжаны грамадзянскай вайной, вывучаны нашымі школамі, у пераважнай большасьці рабоча-сялянскага паходжаньня. Мы ня толькі выхавалі свае маладыя камандныя кадры, але растварылі ў камандзірскім бальшавіцкім асяродзішчы цэлы рад ваенных спэцыялістаў старой арміі, якія спачатку грамадзянскай вайны паказалі сваю адданасьць справе рэвалюцыі.

У сьвятле гэтага вялізарнейшага росту ваеннай і палітычнай магутнасьці Чырвонай арміі прысяга, якую дадуць у гэтым годзе маладыя байцы, набывае асаблівае значэньне. Малады баец, даючы прысягу, атрымлівае і яшчэ будзе атрымліваць ваенна-палітычнае выхаваньне ў зусім іншых умовах арміі. З другога боку, баец, прышоўшы з калгасу, саўгасу, фабрыкі, ужо ня той. Ён вырас культурна, ён вырас палітычна, ён прамаўду пры новай тэхніцы. Такім чынам сам баец, ужо ў значнай ступені падрыхтаваны да новых умоў арміі, будзе ня толькі выхоўвацца, але і АКТЫЎНА САДЗЕЙНІЧАЦЬ далейшаму росту палітычнай і ваеннай магутнасьці Чырвонай арміі.

Вось чаму ў першамайскай прысязе гэтага году будуць гучэць новыя акорды, сугучныя нашай вялікай перабудове, якая адбываецца ў нашай краіне. І гэтыя акорды сацыялізму будуць пачуты далёка за межамі Савецкага саюзу, натхнёючы ўсіх працоўных, усіх

прыгнечаных на барацьбу за зьвяржэньне аджываючага капіталізму.

А. Іофэ.

ВЫСОКА ТРЫМАЦЬ СЬЦЯГ ПРАЛЕТАРСКАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ

Кастрычніцкая рэвалюцыя разарвала ланцуг нацыянальнага прыгнечаньня, паставіўшы крыж на калёніяльна-[illegible] пралетарскага ладу. Яна падарвала нацыянальную варожасьць, расчысьціла глебу для супрацоўніцтва народаў, высунула на сцэну раней забытыя народнасьці, абудзіла іх да новага жыцьця.

Кастрычніцкая рэвалюцыя ня толькі зьнішчыла нацыянальны ўціск, але выпрацавала формы аб'яднаньня народаў. У перыяд грамадзянскай вайны і інтэрвэнцыі супрацоўніцтва народаў прыняло формы ваеннага саюзу. У перыяд пасьляваенны, калі Савецкая краіна перайшла на аднаўленьне зруйнаванай гаспадаркі, ваенны саюз быў да поўнага саюзам гаспадарчым. У 1923 годзе адбылося аб'яднаньне нацыянальных рэспублік у Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Стварэньне саюзу азначала гаспадарчае і палітычнае аб'яднаньне народаў у адзіную шматнацыянальную савецкую дзяржаву. «Такім чынам пралетарыят знайшоў у савецкім ладзе ключ да правільнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня, ён адкрыў у ім шлях да арганізацыі ўстойлівай шматнацыянальнай дзяржавы на пачатках нацыянальнага роўнапраўя і добраахвотнасьці» (з рэзалюцыі XII зьезду РКП(б).

Перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі знайшла яшчэ больш яркае выяўленьне ў перыяд рэканструкцыі ны, у перыяд ажыцьцяўленьня першай пяцігодкі. Першая пяцігодка ў корані зьмяніла твар усіх нацыянальных рэспублік, аб'яднаных у Савецкі саюз. У нацыянальных рэспубліках вырасьлі гіганты сацыялістычнай індустрыі, вырасьлі буйныя саўгасы, калектывізуецца сельская гаспадарка, ліквідуюцца фэадальна-байскія і кулацкія элементы, якія на працягу стагодзьдзяў бязьлітасна эксплёатавалі і трымалі ў цемры працоўнае сялянства. Расьце ў нацыянальных рэспубліках нацыянальная па форме і сацыялістычная па зьмесьце культура. Растуць уласныя пралетарскія кадры, што яшчэ больш [illegible] апору пралетарскай дыктатуры ў былых калёніях расійскай буржуазіі.

У нас, у Савецкай Беларусі, гаспадарчы і культурны ўздым адбываецца на нашых вачох. Аб дасягненьнях БССР за першую пяцігодку даволі многа пісалася ў нашым друку. Трэба адзначыць і падкрэсьліць тое, што гігантскіх посьпехаў Савецкая Беларусь, як і ўсе нацыянальныя рэспублікі, дасягнула **дзякуючы няўхільнаму правядзеньню ленінскай нацыянальнай палітыкі, дзякуючы брацкай дапамозе працоўных усяго Савецкага саюзу.**

Вось чаму вялікадзяржаўныя шавіністы, беларускія нацдэмакраты, шавіністы польскія, яўрэйскія і іншыя, іх агентура ўнутры партыі — нацыянал-апартуністы прабуюць адкрыта ці скрыта атакаваць ленінскую нацыянальную палітыку. З-за прытуленьня клясавай пільнасьці асобных камуністаў нацыяналістычным элементам у радзе месц удаецца ў той або іншай форме працяпчуць свае контр-рэвалюцыйныя ідэі, а часам ажыцьцяўляць іх на практыцы.

Пры дапамозе ЦК УсеКП(б) і ЦО «Правда» мы надаўна выкрылі факты актывізацыі нацыяналістычных элементаў на фронце культуры, у органах Наркамзему і г. д. Лютаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б адзначыў, што «гэтыя клясава-варожыя вылазкі і дзеяньні антысавецкіх, эсэраўскіх, нацыянал-дэмакратычных і бундаўскіх элементаў, якія часта выступаюць пад фальшыва-нацыянальным сьцягам, маглі мець месца ў БССР галоўным чынам таму, што, ня гледзячы на неадпаразовыя ўказаньні і перасьцярогі з боку ЦК УсеКП(б), партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі не зрабілі для сябе сапраўды бальшавіцкіх выводаў з урокаў нацдэмаўшчыны, прышчэпаўшчыны, разьбітых, але яшчэ недабітых у БССР і якія актывізуюцца за апошні час».

Пленум патрабаваў ад усіх партыйных арганізацый, каб пытаньні пра[illegible] вільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі ўмацаваньня [illegible] пралетарскага інтэрнацыяналізму [illegible] Дзяржы нашай штодзённай работы, памятаючы ўказаньні тав. Сталіна, што нацыянальнае пытаньне зьяўляецца сустаўной часткай агульнага пытаньня аб пралетарскай рэвалюцыі, часткай пытаньня аб пралетарскай дыктатуры.

Лютаўскі, а ўслед за ім сакавіцкі пленум ЦК КП(б)Б мабілізавалі партыйныя арганізацыі на барацьбу з буржуазна-кулацкімі нацыяналістычнымі элементамі, на барацьбу з малейшымі скажэньнямі нацыянальнай палітыкі партыі. У партыйных арганізацыях началася поўная перабудова, узмацнілася бальшавіцкая пільнасьць асобных камуністаў.

Аднак, і пасьля папярэджаньняў і зусім ясных указаньняў ЦК, пам прыходзілася і цяпер прыходзіцца сутыкацца з фактамі скажэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, з фактамі над звычай слабага і невыстарчальнага разгортваньня барацьбы за пралетарскі інтэрнацыяналізм.

Прыводзім некалькі фактаў. У Кручанскай ШКМ, Талачынскага раёну, загадчык школай Заяводзін ігнаруе беларусізацыю, прымушаючы беларускіх дзяцей гаварыць і пісаць па-расійску. У тэй-жа школе сеецца нацыянальная варожасьць паміж дзяцьмі. Райана ведае аб гэтым, але чамусьці не рэагуе на гэтыя факты.

У Клімавіцкім дзіцячым садзе, у яўрэйскай групе дзяцей выхоўваюць у шавіністычным духу. У пачатковым інстытуце (Клімавічы) выкладчык Лукомскі украінцаў называе на ігнаш, як хахлаві.

У Горацкім раёне ў ШКМ настаўнік Шчарбакоў адкрыта агітуе супроць беларусізацыі, заяўляючы вучням, што «беларускую мову, як стары лапць, трэба закінуць на дах». Райана, ведаючы аб гэтым факце, нічога не прадпрымае, каб ачысьціць гэту школу ад вялікадзяржаўніка.

У [illegible]чаўскім раёне ў Сарочынскай школе настаўніца Вяржбіцкая, дачка папа, адкрыта праводзіць клясава-варожую работу, распальваючы нацыянальную варожасьць сярод дзяцей, у рэзультаце чаго ў гэтай школе ёсьць рад фактаў антысэмітызму.

На Гомельскім заводзе імя Ланцуцкага член партыі Шут пры прыёмцы гатовай прадукцыі ад рабочых-яўрэяў, заяўляе: «Ад жыдоў я работу ня прымаю». На тым-жа заводзе, у 11 корпусе ўсіх яўрэяў вылучылі ў асобныя брыгады. Калі ў брыгаду т. Варцобы быў накіраван рабочы-яўрэй тав. Ліўшыц, брыгадзір-партыец адмовіўся яго прыняць толькі таму, што ён — яўрэй.

Усе гэтыя факты яшчэ раз даказваюць, што там, дзе прытуплена клясавая пільнасьць камуністаў, што там, дзе няма інтэрнацыянальнага выхаваньня, там адкрыта арудуе клясавы вораг.

Аб неабходнасьці барацьбы за пралетарскі інтэрнацыяналізм сказана і напісана вельмі многа. Аднак, факты прымушаюць яшчэ і яшчэ гаварыць і пісаць аб гэтым.

У першамайскіх лёзунгах ЦК УсеКП(б) ёсьць лёзунг **«За ленінскую нацыянальную палітыку, за адзінства і брацтва працоўных усіх нацыянальнасьцяй СССР».** Гэтым самым ЦК УсеКП(б) яшчэ раз напамінае аб важнасьці пытаньня аб пралетарскім інтэрнацыяналізме, яшчэ раз напамінае, што палітыка партыі ёсьць палітыка «зблізіньня пралетараў і паўпралетараў розных нацыянальнасьцяй для сумеснай рэвалюцыйнай барацьбы» (з праграмы УсеКП(б).

1 мая — сьвята міжнароднай пралетарскай салідарнасьці, сьвята аб'яднаньня ўсіх сіл працоўных супроць клясавага ворага. Зробім-жа лёзунг адзінства і брацтва ўсіх працоўных здабыткам мільённых мас рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных. Ня толькі першага мая, **але заўсёды і пастаянна ў штодзённай барацьбе і рабоце будзем высока трымаць сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму.**

М. Ф.

Па СССР засеяна 18.671 тысяча га

МАСКВА, 29. (БЕЛТА). Паводле даных Наркамзему СССР, становішча сяўбы яравых на 25 красавіка 1933 г. прадстаўляецца ў наступным выглядзе:

Усяго па СССР засеяна 18.671 тыс. га—19,7 проц. пляну. На 20-IV-г. г. яравых было засеяна 13.851 тыс. га—14,6 проц. пляну. У 1932 г. на 25-IV па СССР было засеяна яравых усяго 9.994 тыс. га.

Калгасам на 25-IV-33 г. усяго засеяна яравых 15.369 тыс. га—23 проц. пляну, у тым ліку калгасамі, якія абслугоўваюцца МТС, 9.661 тыс. га—25,1 проц. пляну.

На 20-IV-г. г. усяго калгасамі было засеяна яравых 11.423 тыс. га, у тым ліку калгасамі, якія абслугоўваюцца МТС, 7.494 тыс. га.

На 25-IV-32 г. ўсімі калгасамі СССР было засеяна яравых 8.238 тыс. га, у тым ліку калгасамі, якія абслугоўваюцца МТС, 4.896 тыс. га.

Усяго саўгасамі ўсіх сыстэм на 25-IV г. г. засеяна яравых 2.097 тыс. га—20,8 проц. пляну. На 20-IV-г. г. саўгасы ўсіх сыстэм засеялі яравых 1.579 тыс. га. На 25-IV-32 г. было засеяна 970 тыс. га. Усяго аднаасобнікамі на 25-IV-г. г. засеяна яравых 1.205 тыс. га, на 20-4-г. г. аднаасобнікі засеялі 849 тыс. га і на 25-4-32 г. 786 тыс. га.

Пра рашэньне ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы партыі

Пастанова ЦК КП(б)Б ад 29 красавіка 33 г.

1. Адзначаючы выключна важнае значэньне апублікаванай у друку («Зьвязда» ад 29-IV) пастановы ЦК і ЦКК аб чыстцы партыі, прапанаваць кожнай парт'ячэйцы абгаварыць гэту пастанову і прапрацаваць яе на ўсёй сетцы партасьветы, з тым, каб падрыхтаваць кожную партарганізацыю і камуніста ў паасобку да прадстаячай чысткі.

2. Абавязаць партарганізацыі ўвязаць прапрацоўку гэтага рашэньня з задачамі барацьбы за тэмпы і якасьць сяўбы і выкананьня прамфінпляну на прадпрыемствах.

3. У ходзе барацьбы за бальшавіцкае правядзеньне сяўбы і выканань не прамфінпляну вывучыць кожнага камуніста, ставячы пытаньне аб яго партыйнай вытрыманасьці ў простую залежнасьць ад ступені яго ўдзелу ў барацьбе за важнейшыя задачы (сяўба, прамфінплян), што стаяць перад усёй партыяй.

Калгасы поўнасьцю забясьпечаны насеньнем

МАСКВА, 29. (БЕЛТА). Як відаць з канчатковай зводкі Наркамзему СССР аб зборы насеньня да веснавой сяўбы, калгасы Саюзу поўнасьцю забясьпечылі пасеўную плошчу збожжавых культур насенным матэрыялам. План збору насеньня, устаноўлены ўрадам для калгаснага сэктару, выканан на 20 красавіка на 103 проц.

ПАД СЬЦЯГАМ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЬЦІ І АДЗІНАГА ФРОНТУ—НА БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ ФАШЫЗМУ

ПРАЛЕТАРЫЯТ УСЯГО СЬВЕТУ РЫХТУЕЦЦА ДА 1 МАЯ

ПАРЫЖ, 28. (БЕЛТА). «ЮМАНІТЭ» піша, што прапанова кампартыі і ўнітарных прафсаюзаў аб адзіным мітынгу і адзінай дэманстрацыі першага мая сустракае ўкляпленьне сярод рабочых рэфармісцкіх прафсаюзаў.

Міністар унутраных спраў Шотан забараніў першага мая ўсе дэманстрацыі і мітынгі ў грамадзкіх месцах. Дазволены толькі адзін сход у Вэнсэнскім лесе.

* * *

ВЕНА, 29. (БЕЛТА). Канфэрэнцыя прадстаўнікоў паліцыі, жандармэрыі і мясцовага гарнізону рашыла падаўляць малейшыя спробы нападзіць першамайскую дэманстрацыю. Учорах арыштаваны 2 актывісты кампартыі. Як паведамляюць з Сафіі, балгарскі міністар унутраных спраў забараніў сацыял-дэмакратычнае першамайскае сьвяткаваньне, з прычыны пагрозы перапаўненьня яго ў камуністычную дэманстрацыю.

Прэўленьне рэфармісцкіх прафсаюзаў у Вэнгрыі прапанавала не сьвяткаваць першае мая, а толькі зрабіць кароткія перапынкі ў рабоце. Рабочыя абураны і ядуць падрыхтоўку да камуністычнай першамайскай дэманстрацыі. У БУДАПЭШЦЕ ўжо адбылася перадмайская дэманстрацыя. Паліцыя бяз посьпеху спрабавала арыштаваць дэманстрантаў.

* * *

БЭРЛІН, 29. (БЕЛТА). Тысячы паліцэйскіх і 250 штурмавікоў зрабілі аблаву ў рабочым раёне ШАРЛОТЭНБУРГУ. Ноччу па ўсяму БЭРЛІНУ рабіліся вобыскі на кватэрах рэвалюцыйных рабочых. Арыштавана 14 чалавек. У часе вобыску на аднай кватэры канфіскаван нелегальны нумар нелегальнай «РОТЭ ФАНЭ».

Учора ў клініцы ў рабочым раёне НЭЙКЭЛЬНЕ арыштавана 3 камуністычных актывісты, двое з якіх зьяўляюцца членамі фабзаўкому бальніцы.

* * *

ПРАГА, 26. (БЕЛТА). Чэхаславацкая кампартыя шырока разгарнула падрыхтоўку да першага мая. Па ўсёй краіне будзе праведзена звыш 400 МІТЫНГАЎ і дэманстрацый, якія арганізуюцца кампартыяй. У радзе месц, ня гледзячы на супраціўленьне сацыял-дэмакратычнага кіраўніцтва, адбудуцца сумесныя з сацыял-дэмакратычнымі рабочымі дэманстрацыі. Рад месцовых сацыял-дэмакратычных арганізацый — у гарадзе ЛЕБАЎ (Маравія), КОЛІНЕ, ПЕЧКАХ, ГРАДЭЦ, КРАЛАВЕ, у радзе пунктаў паўночнай Чэхіі — ПАСТАНАВІЛІ СЬВЯТКАВАЦЬ ПЕРШАЕ МАЯ СУМЕСНА З КАМУНІСТАМІ.

Чэхаславацкія ўлады ўсімі спосабамі спрабуюць сарваць выступленьні адзінага рабочага фронту. Акруговыя ўлады ва ЎРАБЛІХ (Сэвэрная) забаранілі арганізуемыя сумесныя першамайскія дэманстрацыі, матывуючы «магчымасьцю парушэньня парадку і спакою». Па тых жа матывах забаронены дэманстрацыі ў ДАНЦЫГУ (Маравія).

* * *

СТАКГОЛЬМ, 28. (БЕЛТА). Як паведамляюць з ОСЛО, пастановы аб сумесных дэманстрацыях і сходах камуністычных і рэфармісцкіх рабочых у дзень першага мая прыняты ў БЭРГЭНЕ, ПОСГРУНДЗЕ, СКІЗНЕ, БРЭНІКУ, ТРОМСЭ, СЛЕМЭСТАДЗЕ, РЭПОСЕ і радзе месц усходняй Нарэгіі. Адлюстроўваючы настрої рабочых, рад газэт мясцовых арганізацый рабочай партыі «Р'юкян», «Арбайтэр блят», «Тэлемарк арбайтэр блят» і «Сэр пядэт» таксама выказаліся за адзіны фронт.

Сацыял-дэмакратычныя лідэры адмовіліся прымаць удзел у першамайскай дэманстрацыі пад знакам адзінага фронту і падрыхтоўкі антыфашысцкага кангрэсу. Камуністычная «Арбайтэр блядэт» зьвяртае да масавага ўдзелу ў першамайскай дэманстрацыі пад сьцягам міжнароднай салідарнасьці і адзінага фронту ў барацьбе супроць фашызму і ваенцы.

* * *

ШАНХАЙ, 28. (БЕЛТА). У сувязі з рядам рэвалюцыйных гадавін у маі месяцы, паліцыя Шанхаю і іншых гарадоў прымае спэцыяльныя меры перасьцярогі на выпадак камуністычных выступленьняў. Арганізацыя сходаў і дэманстрацый у маі будзе дапускацца толькі з дазволу Гаміндану.

Чакаюць, што першага мая будуць прадпрыняты звычайныя ў гэты дзень у Шанхаі меры ваеннага становішча.

У Цзяньсьціне ўлады забаранілі першамайскую дэманстрацыю.

* * *

ТОКІЕ, 29. (БЕЛТА). Паліцыя забаранила 12 першамайскіх пазыўгаў левых саюзаў, у прыватнасьці пазыўг аб барацьбе супроць імпэрыялізму і вайны. Лёзунгі рэфармісцкіх клінскай фэдэрацыі працы ў «Содомэй» ухвалены і апублікаваны. Мітынгі пасьля дэманстрацыі заборонены. Левыя саюзы будуць дэманстраваць асобна, з прычыны адмаўленьня «Содомэй» выступаць сумесна.

Паліцыя ў Фукузка арыштавала вядомую японскую пісьменьніцу Кокамота па абвінавачаньню ў камуністычнай дзейнасьці. Арыштаванаму некалькі месяцаў назад праф. Кісцкога ўкінэрыэтэту Каваками прадпісана абвінавачаньне ў радгаваньні і выпуску камуністычнай літаратуры.

Новая хваля забастовак ахоплівае Польшчу

ВАРШАВА, 28. (Белта). З ЛОДЗІ паведамляюць аб новай хвалі частковых забастовак на тэкстыльных прадпрыемствах Лодзі і ва ўсім Лодзінскім раёне. У сувязі з сабатажам прамысловцамі новага калдагавору, падпісанага ў выніку апошняй усеагульнай стачкі тэкстыльшчыкаў, ужо 10 дзён цягнецца забастоўка 200 тэкстыльшчыкаў фабрыкі «ФЫНСТЭР». Фабрыка занята рабочымі. Бастуюць таксама 500 рабочых плюшавай прамысловасьці. 25 красавіка выбухнула забастоўка 600 рабочых на фабрыцы «ЛЕАНАРД».

Рабочыя фабрыкі ЛЯНГЕ і ЭЦІНГОФ пасьля забастоўкі дабіліся адмаўленьня дырэкцыі ад зьніжэньня зарплаты, якое дырэкцыя меркавала правесьці. Рост забастовачных настрояў наглядаецца і ў БЕЛЬСКАЙ акрузе, дзе прамысловцы імкнуцца ўвесьці новае скарачэньне зарплаты на 15 проц.

19 красавіка выбухнула забастоўка рабочых папяровай фабрыкі ў ЧЭНСТАХОВЕ ў знак пратэсту супроць скарачэньня зарплаты.

24 красавіка бастуючыя абвясьцілі гадоўку. Забастоўка ўсё яшчэ працягваецца. З прычыны зьнясіленьня сярод рабочых павялічваюцца выпадкі страты прытомнасьці. Жонкі галадаючых нападзілі гэтымі днямі бурную дэманстрацыю ў знак салідарнасьці з бастуючымі.

У сувязі з атрыманьнем зарплаты і масавымі звальненьнямі, хваля частковых забастовак паднялася таксама ў ДАМБРОЎСКІМ БАСЭЙНЕ і ў ВЕРХНЯЙ СІЛЕЗІІ.

На шахтах «БАСЬКА» і «КАЗІМЕЖ» частковая забастоўка прымусіла дырэкцыю выплаціць рабочым затрыманую зарплату.

На шахце «ЕЛЕНА» гарнякі праводзяць забастоўку з 7 красавіка. З Верхняй Сілезіі паведамляюць аб выбухнуўшай частковай забастоўцы на заводзе «БІСМАРК». Бастуюць усе 270 рабочых. Прычына забастоўкі — звальненьне 96 рабочых.

Рабочая партыя крытыкуе антысавецкую палітыку цьвёрдалобых

ЛЁНДАН, 28. (БЕЛТА). Як паведамляе «РЭЙТЭР», правадыр рабочай партыі ЛЕНСБЭРЫ ў публічнай прамове заявіў, што Англія знаходзіцца ў стане эканамічнай вайны з СССР. Забарона ўвозу савецкіх тавараў у Англію, па водле яго слоў, была адным з самых глупых і злачынных дзеяньняў, прадпрынятых капі-небудзь якім бы то ні было ўрадам супроць прыцельскай дзяржавы. Ленсбэры ўказаў, што першага мая на кожным сходзе будзе заўлён катэгарычны пратэст супроць гэтага барбарскага мэтаду ўрэгуляваньня спрэчак.

ПАЗШ сталі на шлях інфляцыі

ВАШЫНГТОН, 29. (БЕЛТА). Сэнат ухваліў законапраект, які дае права прэзыдэнту ўмыць шырокую эмісію папяровых грашовых знакаў, незабясьпечаных золатам, і зьніжць зьмяшчэньне золата ў даляры максымум на 50 проц. Законапраект дае паўнамоцтвы прэзыдэнту дазволіць неабмежаваную чаканку срэбра і прыняць у кошт плацяжоў па ваенных даўгох 200 млн. даляраў у срэбры.

Адначасна сэнат зацьвердзіў законапраект, які мае на мэце павышэньне цэн на сельска-гаспадарчыя прадукты і дае прэзыдэнту права дазволіць міністэрству зямляробства выплачваць фэрмэрам прэміі за скарачэньне пасеўнай плошчы.

Польскі пралетарыят напярэдадні 1 мая

Баявое сьвята 1 мая ў гэтым годзе працоўныя масы Польшчы будуць праводзіць у вельмі адказнай і напружанай сітуацыі. Крызіс прымае ўсё больш вострыя формы, прывяла прадукцыі ва ўсіх галінах прамысловасьці падае ўніз, набліжаецца фінансавы крызіс. У горадзе расьце беспрацоўе, расьце колькасьць паўбеспрацоўных, у вёсцы у цэлых раёнах панае голад. Падаткі, выціскаемыя перш за ўсё для ваенных мэт, становяцца не пад сілу для мільёнаў сялянскіх мас, якія пакутуюць пад уціскам паўпрыгоньніцкага ярма, і ўсё больш паўпэрызуюцца.

У такой сітуацыі, гледзячы ў будучае з дрэнна скрытай трывогай, польскі фашызм—буржуазія і памешчыкі—шукаюць выхаду з тупіка, у якім аказалася польская дзяржава, у растучым націску на рабочую клясу і працоўных сялян. Працоўныя масы Польшчы, Заходняй Беларусі і заходняй Украіны знаходзяцца ў агні бязупынных атак з боку фашысцкага капіталу, атак, якія яны з посьпехам адбіваюць у гераічных баёх. Уся Польшча зьяўляецца цяпер полем шалёнай клясавай барацьбы па між фашызмам і змагаючымся пад кіраўніцтвам КПП рэвалюцыйным лягерам. Усеагульныя забастоўкі гарнякоў і тэкстыльшчыкаў, сотні выбухаючых ва ўсёй краіне баявых [illegible], якія суправаджаюцца нярэдка вострымі сутыкнамі з ваенна-паліцэйскімі сіламі фашызму, забастоўкі польскіх украінскіх і беларускіх сялян, сялянскія паўстаньні ў розных раёнах і што вельмі характэрна для цяперашняй фазы рады калізацыі, забастоўкі служачых,—вось малюнак узрастаючай хвалі ўсеагульнага гневу працоўных мас. Не дапамагаюць вядомыя мэтады адцягненьня ўвагі мас ад іх рэвалюцыйных задач: ваенная і нацыяналістская антысэміцкая агітацыя, якую цяпер, асабліва ў сувязі з завастрэньнем польска-нямецкіх адносін, разгортвае польская буржуазія. Не падсабляе дапамога выпрабаваных сацыял-фашысцкіх правадыроў, якія працуюць утрымаць свой уплыў у рабочых масах самымі рэвалюцыйнымі фразамі. Не дапамагае абвостраны тэрор, штодзённа ўзрастаючы пес шыбеніц, увядзеньне палявых судоў у арміі. Сіла і воля барацьбы, актыўнасьць і нанавісьць да ворагаў так моцныя у масах, што яны з ўсё большым посьпехам дамаюць загародкі, якія стаяць на шляху рэвалюцыйнай барацьбы. Апошнія стачкі польскага пралетарыяту, якія праходзяць у большасьці выпадкаў пад кіраўніцтвам КПП, паказваюць, што на сьпяваюць рашучыя бае, што Польшча набліжаецца да рэвалюцыйнага крызісу.

Сьвята 1 мая будзе баявым днём зьбіраньня сіл, дэманстрацыі шматтысячных працоўных мас для надыходзячых вялікіх баёў пад лёзунгам «супроць фашызму, супроць ураду голаду і вайны, супроць ваенна-нацыяналіцкай агітацыі, супроць сацыял-фашызму, за рэвалюцыйны выхад з крызісу, за захват зямлі працоўным сялянствам, за самавызначэньне акупаваных зямель, за адзіны фронт барацьбы, за Савецкую Польшчу!

Ян Бялецкі—прадстаўнік польскай кампартыі ў ВККІ.

Арышты савецкіх грамадзян у Германіі працягваюцца

БЭРЛІН, 29. (ТАСС). На днях савецкія служачыя Наркамцяжпраму КІРЗЕЎ і КАРКЛІНЕЎСКІ былі арыштаваны ў паездцы пры звароце з ДЗЮСЭЛЬДОРФА ў БЭРЛІН. Іх пасад